4Ба 614

Выданне „Вольнае Беларусі“.

# ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ КОЖНАМУ БЕЛАРУСУ.

**Зборнік артыкулау розных аутарау:** М. Міцкевіча, Я. Лёсіка, В. Ластоўскаго, М. Багдановіча, Пётры з Арленят і інш..

МЕНСК — 1918 г.

Друкарня А. Я. Грынблята.

1Ба 614

# Што трэба ведаць кожнаму беларусу?

## I. Беларускі народ.

*Хто мы?*

Мы — беларусы.

*Хто есьць беларусы?*

Беларусы — гэта народ славянскаго племя.

*Чаму мы называемся беларусамі?*

Бо мы нарадзіліся беларусамі, ускарміліся з беларускае зямлі, узгадаваліся і жывом на Беларусі.

*Хто гэта — беларус?*

Беларус той, у чыіх жылах цячэ беларуская кроў, чые прадзеды, дзяды і бацькі былі беларусамі.

*Як называецца той, хто вырэкаецца свайго народу?*

Той, хто вырэкаецца свайго народу,—здраднік, душапрадауца. Здрада—гэта найцяжэйшае ліхадзейство, якое толькі ведаюць людзі. Дзеля гэтаго мы ніколі ні пакінем свайго народу. Шчыры беларус, праудзівы сын свайго народу заусёды будзе тэй думкі: «Ніхай лепей загіну, чымсі адракуся ад свайго народу беларускаго». Бо з Беларусьсю і з беларускім народам зьвязано нашае жыцьцё. Гэта нашае найвышэйшае дабро, нашая радасьць і слава.

Бел/ХD
Бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

*Што такое народ, або нацыя?*

Народ, або нацыя, гэта людзі, каторыя тавораць аднэй мовай, засяляючыя суцольны край і праз гэта складаючыя адну вялікую сямью, народ, нацыю.

*Хто прыналежыць да народу, або да нацыі?*

Кожны, хто паходзіць з аднаго народу, або нацыі. Прыналежнасьці да нацыі, ці народу, нельга выбіраць паводле сваіго густу, ці спадобы. Прыналежным да народу стаецца кожны чалавек ужо па сваей крыві, па сваей прыродзе, целам і душой сваей. Сьвядомым грамадзянінам народу сваіго становіцца беларус толькі тагды, калі ен усьвядоміцца,—гэта значе, спазнае добра, хто ен сам ды начуе духоуную і кроуную зьвязь з усім сваім народам.

Народная сьвядомасьць зблізае і злучае людзей у адну моцную сямью. Даражэйшы і мілейшы нашаму сэрцу будзе кожны беларус, хоць-бы ен найдалей ад нас жыу, бо ен прыналежыць да нашаго народу беларускаго, бо гэта наш брат па народнасьці. Усе іншыя народы, хоць-бы яны і жылі на Беларусі, аднак яны нам чужыя, бо яны спагадаюць і любяць кожны свой народ і сваю Бацькаушчыну, а з нашае зямлі і народу толькі цягнуць для сябе сокі.

*Ці есьць іншыя народы?*

На сьвеці многа розных народау. Кожны іншы народ нам чужы, а есьць паміж імі і цяжкія нашыя ворагі, якія здауна ужо упарта працуюць над тым, каб беларусау выгубіць ды самым заняць нашую зямлю і нашае дабро. Кожны такі ворак старасцца угаварыць цемных нашых братоу, каб яны выракліся сваіго роднаго: і мовы, і песьні, і граматы, а заміж нашаго, роднаго, падсуваюць свае, чужацкае. Асьцерагайцеся-ж, браты, такіх авечак у воучай скуры!

## II. Беларуская зямля.

*Дзе жывуць Беларусы?*

Беларусы жывуць на сваей Беларускай зямлі. Беларуская зямля уся тая, дзе жывуць Беларусы.

*Як вяліка Беларусь?*

Беларусь вялікая старонка. Па свайму абшару Беларусь займае сярэдняе мейсцо паміж Італіей і Эуропэйскай Турцыей.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Аустрыя | займае | 600.000 | км. |
| Нямеччына | „ | 540.000 | „ |
| Францыя | „ | 536.000 | „ |
| Англія | „ | 315.000 | „ |
| Італія | „ | 286.000 | „ |
| *Беларусь* | „ | *258.000* | „ |
| Турцыя | „ | 130.000 | „ |
| Румынія | „ | 131.000 | „ |
| Баугарыя | „ | 96.000 | „ |
| Португалія | „ | 91.000 | „ |

Якая-ж то дужая будзе дзяржава з Беларусі, калі станецца яна ад нікога нізалежная ды стане справавацца сама, сваімі людзьмі, беларусамі!

*Ці жывуць Беларусы па-за межамі Беларусі?*

Дзеля таго, што над Беларусамі пануюць чужынцы, ні раз прымушаны былі Беларусы пакідаць сваю Бацькаушчыну ды выціраць чужыя куткі. Вельмі многа Беларусау перасялілося у Сібір, у Амэрыку, у Бразылію, у Азію, а такжэ па усей Маскоушчыне.

*Колькі усіх Беларусау?*

Беларускаго народу жыве на сьвеці 10 мільёнау. Паміж эуропэйскімі народамі Беларусы займаюць 9-е мейсцо. Лічба народу у Эуропі (ні лічучы іншых частак сьвету) выглядае так:

| | |
|---|---|
| Немцау . . | 74 мільен.. |
| Маскалеу . | 65 |

| | | |
|---|---|---|
| Французау | . . 42 | мільён.. |
| Англікау | . . 40 | „ |
| Італьянцау | . . 34 | „ |
| Украінцау | . . 33 | „ |
| Гішпанцау | . . 18 | „ |
| Палякоу | . . 15 | „ |
| *Беларусау* | . . *10* | „ |
| Румынау | . . 9 | „ |
| Жыдоу . | . . 9 | „ |
| Голендрау | . . 8 | „ |
| Вэнграу | . . 7 | „ |
| Чэхау . | . . 7 | „ |
| Фінау . | . . 7 | „ |
| Швэдау | . . 6 | „ |
| Баугарау | . . 6 | „ |
| Грэкау . | . . 5 | „ |
| Португалау | . . 5 | „ |
| Сэрбау . | . . 5 | „ |
| Туркау | . . 5 | „ |
| Норвэжцау | . . 5 | „ |
| Ірляндцау | . . 4 | „ |
| Літвіноу | . . 3 1/2 | „ |
| Харватау | . . 3 | „ |
| Славакау | . . 3 | „ |
| Славінцау | . . 2 | „ |
| Албанцау | . . 1 | „ |

## III. Беларуская мова.

*Што такое народная мова?*

Народная мова тая, якой гаворыць увесь народ. Кожны народ мае сваю родную мову і ей усюды гаворыць. Родная мова вялікае народнае багацце, якое народ павінен высока цаніць і пялегаваць.

*Па чым лягчэй спазнаць, што мы Беларусы?*

Найлягчэй гэта спазнаць па нашай мове. Мова злучае людзей у адзін народ. І нашая беларус-

кая мова злучае звыж 10-і мільенау Беларусау у адзін народ.

*Чаму мы гаворым беларускай мовай?*

Бо яна наша родная, а кожны чалавек любіць сваю родную мову: немяц — нямецкую, баугарын — баугарскую, а беларус — беларускую. I усе,што пекнае, што добрае, усе мудрасьці сьвету — навуку, літэратуру—мы найлепей разумеем і любім, калі чуем у сваей роднай мове. У сваем доме мы, бывае, мала бачым сваю любоу да нашай мовы. затое, будучы на чужыне, як толькі пачуем нашую мову, дык вельмі цешымся. Бо чалавеку наймілей чуць і гаварыць сваей роднай мовай.

*Якая наша мова?*

Наша мова адна з найчысьцейшых у славянскай сямьі мова. Яна пекная, мілагучная, вельмі сьпеуная і гібкая, праз што надаецца вельмі да паэзіі і сьпеву. Дзеля таго, што мова наша захавала даунейшы славянскі характар, яна—як маці у славянскай сямьі моу: да яе, як дзеці да маткі, падобны усе славянскія мовы: маскоуская, сэрбская, чэская, украінская, польская і інш.. Але пры гэтым яна зусім асобная, самабытная мова, як і кожная іншая. Ворагі нашаго народу лгуцъ, што мова наша ні самабытная,калі кажуць:«гэта мешаніна маскоускай і польскай». Гэтак могуць гаварыць тольк нашыя зладумцы, або цемныя людзі. Шмат вучоных людзей розных народнасьцей навучаліся нашай мовы і пісалі аб ей вучоныя кнігі, і усе яны у адзін голас кажуць, што мова беларуская саусім самабытная асобная мова, такая-ж самая асобная славянская мова, як польская, ці маскоуская.

Дауней наша мова была аднэй с самых культурных усходна-славянскіх моу: ею гаварылі князі нашыя, князі і вельможы Вялікаго Княства Беларуска-Літоускаго ды каралі Польскія.

У беларускай мове у Вялікім Князстве Беларуска-Літоускім пісаліся усе законы, вяліся усе урады і суды, адбываліся соймы і інш.. С тых часоу захавалося многа дакумэнтау, кніг, грамат, і усе яны пісаны чысьцюсенькаії нашай беларускаю мовай.

*Ці маюць беларусы сваю літэратуру (пісьменнасьць)?*

Мы, беларусы, маем багатую сваю асобную пісьменнасьць. Беларуская пісьменнасьць старэйшая за польскую і маскоускую. З усіх славянскіх народау, адны толькі чэхі мелі раней за беларусау надрукованую Біблію у сваеії мове.

| | | |
|---|---|---|
| Чэская Біблія выдрукована у | 1488 | г. |
| Беларуская . . . | 1517 | „ |
| Краінская . . . | 1555 | „ |
| Польская . . . | 1561 | „ |
| Літоуская . . . | 1660 | „ |
| Маскоуская . . . | 1751 | „ |

Беларусы у даунейшыя часы мелі вельмі багатую сваю пісьменнасьць. У XVI сталецці былі напісаны і надрукованы у беларускаії мове усе законы, кнігі духоуныя (праваслауныя, каталіцкія, ўніяцкія і рэформацкія), гістарычныя, навуковыя і усякія іншыя. Посьля наш народ занепау, яго задушылі, заціснулі, пры гэтым і пісьменнасьць заглушылі. Калі нашая Бацькаушчына падпала пад Расію (Масковію), то і зусім забаранілі што небудзь пісаць і друкаваць па-беларуску. Толькі у 1905 г., у часе расійскай рэвалюцыі, беларусы дабіліся права друкаваць кнігі у сваеії мове. За кароткі час ад 1905 г. беларускія паэты і пісьменнікі напісалі многа пекных і цікавых кніжак, стварылі новую беларускую літэратуру. Цяпер беларусы маюць німалую і новую сваю літэратуру і шмат газэт і часопісау.

*Ці беларуская мова адна на усей Беларусі?*

Адна і тая самая на усей Беларусі. Але як усе старадауныя мовы, так і нашая, мае свае адмены,—дыялекты, або гутаркі. У нас есьць шэсьць дыялектау, або гутарак: віцебская, смаленская, налеская, цэнтральная (менская), слуцкая, барысауская.

*Чаму іншыя беларусы стараюцца гаварыць чужой мовай, замест свае?*

Тыя беларусы, што стараюцца гаварыць чужой мовай, унікаючы свае, бываюць або шэльмы душапрадауцы ды перакульшчыкі, або людзі цемныя, якіх аблуталі ворагі нашаго народу. Першыя ні гавораць па-беларуску дзеля свае асабістае карысьці, бо пайшлі у найміты да чужынцау і працуюць зусім сьвядома на шкоду Беларускаму народу, каб яго выгубіць. Другія ні гавораць праз цемнату сваю, бо паверылі нашым ворагам, што мова наша „брыдкая“, «простая» і за рознымі нашымі злодумцамі ідуць, як авечкі, на бойню. Павіннасьць кожнаго сьвядомаго беларуса с першымі — ворагамі— змагацца, а другіх — цемных — усьведамляць, выясьняючы ім прауду і навучаючы гісторыі нашай ды шыручы беларускае друкованае слово.

*Што-б сталося, каб мы забыліся свае роднае мовы?*

Калі-б мы нашую родную, Богам нам дадзеную і усьвячоную, беларускую мову закінулі, забыліся, а прынялі чужую, — тагды па усіх нас і сьлед загіну-бы на зямлі.

Наш поэт Мацей Бурачок у прадмове да «Беларускай Дудкі» кажэ: «Шмат было такіх народау, што страцілі найперш сваю мову,—так, як той чалавек перад сканаппем, катораму мову займае, посьля і зусім замерлі. Ні пакідайце-ж мовы нашаі беларускай, каб ні умерлі! Пазнаюць людзі людзей на абліччу ці па адзежы, якую хто носіць, — от-жэ

мова гэта есьць аблічча і адзежа душы людзкой.»

Хто ні шануе родную мову, той ні шануе сябе самога, ні свой род, ні сваіх дзядоу-бацькоу, каторыя тэй-жэ мовай гаварылі. А хто стыдаецца роднай мовы, варт таго, каб і яго добрыя людзі стыдаліся, як вырадка, каб ім пагарджалі, як нідалюдкам. Бо стыдаючыся роднай мовы, ен крыудзіць ні толькі дзядоу-бацькоу сваіх, але і увесь народ. Справядлівы, добры чалавек ніколі ні стыдаецца роднай мовы. Ен і сам гаворыць сваей роднай мовай і глядзіць, каб і іншыя яе шанавалі.

## VI. Гісторыя Беларусі.

*Што такое нашая гісторыя?*

Нашая гісторыя — гэта мінуушчына роднае старонкі, — усе тое, што колісь было на Беларусі.

*Якая нашая мінуушчына?*

Нашая мінуушчына — гэта безупынная барацьба за лепшую долю і волю нашага народу.

У найдаунейшых часох беларусы кіравалі усім сваім жыццем праз вечо, гэта значэ, старшыны нашаго народу радзілі і настанаулялі аб усем. Посьля беларусы пачалі выбіраць сабе князеу. Княжацкая улада была дзедзічнай, пераходзіла з бацькі на сына. Нашыя князе мелі сваю вяліка-княжацкую сталіцу у Полацку, а удзельныя княжацкія сталіцы былі у Віцебску, Менску, Друцку, Смаленску і шмат яшчэ гдзе. Каля XIII-го сталецця Беларусь была падзелена па многа дробных княствау, а гэта таму, што посьля сьмерці бацькі-князя сыны дзялілі «вотчыну», як цяпер, прымерам, дзеляцца у нас па вёсках селяне. Ад гэтаго народ беларускі аслабеу быу вельмі і чуць ні падупау пад абладу чужынцау.

Важнейшыя з нашых князеу былі: Рогвалод (князявау у Полацку у X сталецці), Ізяслау, Бра-

чыслау ды Усеслау. Гэты апошні найболей уславіуся: яму у чэсьць і свае і чужыя складалі песьні і пахвалы. Аб ім адна старасьвецкая песьня кажэ: «князь Усеслау людзей судзіу, князем гарады нарадкавау».

З роду князеу полацкіх былі і князі Вялікаго Княства Беларуска-Літоускаго. З гэтых князеу найбольш уславіуся Альгэрд ды Вітаут. Альгэрд хадзіу вайною на Маскву і Маскву здабыу ды шчыт свой прыбіу на Маскоускіх варотах. Вітаут уславіуся мудрасьцю і сілай, ен хацеу каранавацца на караля Беларуска-Літоускаго, але палякі адабралі ад паслоу залатую карону, каторую прыслау яму папа на каранацыю. З роду беларуска-літоускіх князеу пахадзілі і каралі польскія (Ягэллоны). А Ягэлло, каторы быу і каралем польскім, да канца жыцця свайго ні умеу гаварыць па-польску, а толькі па-беларуску. І ні дзіво, бо маці яго была княгіня віцебская, і ен гадавауся у Віцебску і быу там князям.

У Вялікім Княстве Беларуска-Літоускім беларуская мова была дзяржаунай. Па-беларуску адбываліся усе суды і соймы, пісаліся усе дакумэнты, па-беларуску гаварылі усе паны, вяльможы, князі, па-беларуску вучыліся у школах і маліліся у цэрквах і касьцелах. Словам, усе жыцце, увесь лад, звычай і абычаі былі беларускія.

Посьля Беларуска-Літоускае Княство злучылося с Польшчай, як «роуны з роуным і вольны з вольным». Але еднасьць гэтая ні прынесла дабра ні беларусам ні літоуцам. Палякі адабралі у нас і нашу волю і роунасьць, упраглі беларускі народ у паншчыну, а паноу і духавенство папалячылі. За 200 год польскай вольнасьці і роунасьці Беларусы асталіся нівольным, мужыцкім толькі народам, без свае пісьменнасьці, без дзяржаунаго і грамадзянскаго права. А у канцы XVIII-го сталецця, посьля

раздзелу Польшчы, беларусы трапілі із агню ды у полыме — с польскіх у «братніх» маскоускія абоймы. Посьля палякоу беларусы засталіся чуць жывыя, а тут маскоускія «браты» пачалі саусім іх душыць, каб сьцерці сьлед Беларускаго народу, каб беларусау абмаскаліць. Палякі цягнулі беларусау каталікоу да сябе,а маскалі—праваслауных беларусау да сябе. Адны і другія стараліся, каб беларусы забыліся, што яны беларусы, асобны народ, што наша зямля ні нашая, а маскоуская або польская і што яны тут воучым правам сталіся гаспадарамі. Але народ наш і у гэтай чужацкай папасьці выявіу нізвычайную жывучасьць і моц.

Ніякія польскія путы, ніякія маскоускія нагайкі і вастрогі ні здолелі адабраць ад нашаго народу яго найдаражэйшаго скарбу — роднае мовы. Усе, што маглі яны адабраць, яны адабралі: і школы, і цэркві, і зямлю, і лясы, і рэкі, і гарады, і багацце, а от мовы у нашаго народу ні здолелі адабраць! А калі наш народ захавау мову, то ен жыве і будзе жыць. Праз мову наш народ здолее адрадзіцца ды зноу зрабіцца вялікім і сільным.

## IV. Вера (рэлігія) Беларуса.

*Якая вера Беларуса?*

Беларусы усе хрысьціянскай веры; часткаю каталікі, а часткаю праваслауныя.

У Гродзеншчыне і Віленшчыне многа есьць беларусау каталікоу, а у Магілеушчыне, Віцебшчыне, Смаленшчыне і Чарнігаушчыне болей беларусау праваслаунае веры, хоць есьць там і каталікі. Даунеи многа было сярод беларусау вуніятау, прынявушых царкоуную еднасьць, але царкоуную вунію збурыу Маскоускі урад, хочучы абмаскаліць беларусау. Але вера, ці, як кажуць, рэлігія, ні перашкаджае людзям захоўываць народную еднасьць. Ся-

род немцау, напрыклад, есьць каталікі і пpотэстанты, але-ж яны складаюць адзін нямецкі народ. Так і беларусы — праваслауныя і каталікі — складаюць адзін беларускі народ.

*Ці вера можэ азначаць народнасьць?*

Не, вера што іншае, а народнасьць што іншае, і дзеля гэтаго вера ні можэ азначаць народнасьці. Напрыклад, палякі есьць каталіцкае і кальвінскай веры; немцы есьць каталікі, лютэране і кальвіны, але і палякі і немцы становяць адзін народ,—адны польскі, а другія нямецкі. Каталіцкай веры італьянцы, французы, есьць ангельцы, немцы, беларусы, але гэта розныя, чужыя сабе народы.

Усе беларусы, ці яны праваслауныя ці каталікі, роуныя дзеці аднае маткі Беларусі, то і трэба нам жыць паміж сабою у згодзі і узаемна шанаваць адну і другую веру. Гэта таму, што родзімся мы беларусамі, а верными — праваслауными ці каталікамі — становімся посьля хрысьцін. Падобна і партыйнымі людзьмі (соцыяль-дэмакратамі, соцыялістамі-рэвалюцыянэрамі, радыкаламі, нацыяналь-дэмакратамі) робімся куды пазьнейі, але усе эта ні перашкаджае нам быць добрымі Беларусамі і разам стаяць за народную волю, за лепшую будучыну усяго нашаго народу і краю.

## V. Бацькаушчына.

*Што такое Бацькаушчына?*

Бацькаушчына — гэта той край, гдзе мы нарадзіліся і вырасьлі, гдзе жывуць нашыя бацькі і дзяды жылі, гдзе жыве увесь беларускі народ.

*Дзе маюць Беларусы сваю Бацькаушчыну?*

Нашая Бацькаушчына—гэта беларуская зямля, дзе беларусы жывуць спакон веку, абрабляючы гэтую зямлю сваімі рукамі, палiваючы яе сваім потам і крывей, бароночы яе ад ворагау. І у насса

мых, у нашым характару адбілася нашая Бацькаушчына, а у сэрцы носім ясную, ніколі ні загасаючую памяць аб сїі. Бацькаушчына — гэта нашыя бацькі і нашыя дзеці. У кожным з нас захована мінуушчына і будучына роднаї нашае зямлі. Таму мы са сваімі семьямі, маетнасьцю, з усімі нашымі таварыствамі, з нашымі селамі і гарадамі належым да вялікаї нашаї Бацькаушчыны — Беларусі.

*Адкуль узяліся на гэтай зямлі Беларусы?*

Гэтую зямлю Беларускую заселяе наш народ ад найдаунейшых часоу. Як памяць людзкая сягае, заусюды на гэтаї зямлі жылі Беларусы. Яны аселі на гэтаї зямлі у тоїі час, як яна была ні аброблена і дзікая, і сваімі рукамі, сваею ніутомнаї працай перарабілі яе на ураджаїную і багатую.

## VII. Адзнакі Беларусі.

*Якія адзнакі беларускай дзяржавы?*

Адзнака Беларускае дзяржавы — гэта гэрб даунейшаго Вялікаго Княства Беларуска-Літоускаго: віцязь на белым каню у чырвоным полі. Гэтым гэрбам адзначаліся дауней усе беларускія землі, або—як іх пазьней звалі— ваеводзтвы.

*Які нацыянальны беларускі колер?*

Нацыянальны беларускі колер — бела-чырвоны. З гэтых колерау зложан і беларускі флаг, які складаецца с трох, удоужкі, палосак — белаї, чырвонай і зноу белай.

## VIII. Патрыотычныя павіннасьці.

*Што такое патрыотызм?*

Патрыотызм—гэта шчырая любоу да свайго роднаго народу і да свайго роднаго краю. А патрыот—гэта тоїі чалавек, каторы старaецца дапа-

магчы свайму народу і працуе у гэтым кірунку з усіх сіл.

*Чаго мы хочэм для свае Бацькаушчыны?*

Кожны з нас любіць Беларусь і хацеу-бы бачыць яе шчасьлівай. А гэта станецца тагды, як усе беларусы стануць сьвядомымі сынамі свайго народу і калі самі беларусы стануць газпадарамі у сваей зямлі, калі над намі ніякія чужакі ні будуць панаваць. Дзеля гэтаго ні тольві самым трэба любіць Бацькаушчыну і працаваць для яе дабра, але трэба яшчэ навучаць і прыхіляць да гэтаго усіх беларусау, з якімі спатыкаешся, будзіць у іх гэтыя высокія добрыя пачуцці

*Якая патрыотычная павіннасьць кожнаго беларуса?*

Сьвятая павіннасьць кожнаго беларуса зауседы і усюды прызнавацца да свайго народу, дбаць аб гонар свае нацыі ды пільна выпауняць усе, што спрычыняецца да узмацавання і эдукацыі нашаго народу.

Дбайма-ж аб родны край, пільнуймася-ж сваіх павіннасьцяу перад ім! Старваймася, каб імя Беларус зауседы, у усіх народау сустрэчалося с пашанай.

*Якім способам беларус можэ дбаць аб узмацаванне і эдукацыю свайго народу?*

Кожны чалавек павінен свой народ любіць, ім гардзіцца, для яго цабра і славы жыць і працаваць; усей сілай дбапь аб падняцце, славу і гонар яго. Кожны патрыот-беларус болей, чым хто

іншы. ніхай старасцца выпаўняць свае патрыотычныя павіннасьці, бо у нас болей, чым у іншых, працы, бо мы адсталі ад іншых. Беларускі патрыот можэ дбаць аб узмацаваньне і расьцвет свайго народу праз сямью і школу і праз грамадзянскую працу.

## IX. Беларус у сямі.

*Якія павіннасьці беларуса у сямі?*

Першая павіннасьць, каб у сямі беларускай гаварылі і маліліся па-беларуску і каб заховываліся звычаі і абычаі беларускія; каб па асобах ды на рэчах і па усем, што есьць у гасподзе, выяуляуся беларускі характар: уселякія узоры, малюнкі, вышыукі павінны быць у беларускім гусьці. У кожнай беларускай сямі павінны быць кніжкі беларускія і часопісі. Благі той беларус, што чытае у сваей сямі ні сваю беларускую, а чужую, у чужой мове газэту.

Як-бы далейшым працягам сямі для маладзежы есьць школа. Беларуская сямья павінна старацца, каб дзеці яе вучыліся у беларускай школе. Чужая школа дагэтуль навучала беларускіх дзяцей любіць чужое і зьняважаць свае роднае і свой народ, сваю мову і звычаі. Чужая школа гадавала з нашых дзяцей людзей чужых для нашаго народу. Дзеля гэтаго, кожны патрыот павінен дакладаць усіх сіл, каб усюды, дзе жывуць беларусы, былі беларускія пачатковыя, сярэднія і вышэйшыя школы. Сямья — гэта аснова, фундамэнт нацыі, а школа—яе будучына. Беларускі патрыот

павінен дбаць яшчэ і аб тое, каб у беларускіх семьях сьпеваліся беларускія песьні і каб у школах навучалі сьпеваць патрыотычныя беларускія песьні.

*Беларус у грамадзянскім жыцці.*

Беларускае грамадзянскае жыцце твораць грамады, суполкі, таварыствы, установы, а такжэ наш тэатр, канцэрты, забавы, часопісі, промысел, гандаль,—гэта усе мейсцы публічнаго грамадзянскаго жыцця і лучнасьці.

Дык і трэба, каб усюды у грамадзянскім жыццю беларус выступау з гонарам і развагай, а глаунае—справядліва і слушна. На сабраннях і нарадах—будзь-то гаспадарскіх, купецкіх, духоуных, палітычных ці іншых—сьвядома беларус павінен судзіць аб усем, выходзячы с патрэб і карысьці беларускаго народу.

Выбіраючы людзей на урады і прэдстауніцтвы, трэба пільнавацца, каб ні выбіраць людзей чужых, ворагау нашаго народу і нашай справы. Наадварот, трэба заусюды старацца на усякія урады выбіраць добрых, сумленных і сьвядомых беларусау. Высьцерагайцеся даваць уласьць над сабою людзям чужым і нівядомым!

*Як паступаць, каб наша становішчо было ясным?*

Каб наша становішчо было ясным, мы павінны быць наскрозь беларусамі. Ні толькі усюды са усімі гаварыць па-беларуску, але і вымагаць, каб подпісы у крамах, дзе мы купляем тавары, былі

па-беларуску, а такжэ жадаць беларускіх тавараў і вырабаў. Словам, старацца, каб наша Бацькаўшчына наскрозь мела наш родны беларускі выгляд.

*Як паступаць у урадах?*

У урадах, воласьці, судзе і усюды трэба нам гаварыць толькі па-беларуску і бараніць свайго на гэта нацыянальнаго права.

### X. Беларус на чужыні.

*Ці мае беларус аглядаць чужыну?*

Сьвет — гэта найлепшая школа жыцця. Хто многа бачыў, той многа ведае. Кожны, хто толькі можэ, ніхай аглядае, ні толькі свой родны край, але і заграніцу.

*Як павінен трымацца беларус на чужыні?*

Ніхай памятае, што чужынцы, угледаючыся на яго, будуць судзіць аб усім народзе. Дык ніхай беларус на чужыні годна і паважна прэдстаўляе сваю нацыю.

*Ці трэба вучыцца чужой мовы?*

Трэба,—чым болей чалавек ведае, тым яму лепей, бо ен робіцца больш эдукованым. А толькі добра эдукаваны чалавек можэ многа зрабіць для свае Бацькаўшчыны. Хто ведае чужую мову, той можэ чытаць чужыя кніжкі і часопісі, можа даведацца з іх многа для нас карыснаго, што трэба было-б, каб і у нас было. Гаворучы с чужымі людзьмі, разскажэ такі чалавек і аб нашым народзе аб нашым жыцці. Бо часам на чужыні ведаюць

аб нас толькі тое, што напішуць аб нас нашы ворагі. Але перш за усе, і на чужыні будучы, кожны беларус павінен добра знаць сваю мову, сваю географію, гісторыю, мастацтво, літэратуру, словам — усе жыцце, каб, будучы на чужыні, ні рабіу сам сораму нам, але годна заступау і абараняу наш народ ды дзеля яго дабра працавау.

### XI. Чым можэм гардзіцца.

*Мы гардзімся, што мы Беларусы.* Бо мы народ здольны, з нашаго народу выйшло многа слауных людзей, за якіх ніколі нівыплачэны доуг маюць перад намі і палякі (Касьцюшка, Міцкевіч, Сыракомля, Крашэускі і шмат інш.) і маскалі (Дастаеускі, Сымон Полацкі і шмат інш.) і іншыя нашы суседзі. Пра нашу здольнасьць сьведчаць такжэ нашы звычаі і абычаі, нашае будауніцтво, усякія культурныя памяткі і інш..

*Мы горды са свае мовы!* Бо наша мова мэльодыйная, багатая і вельмі надаецца да песьні і паэзіі. А да таго-ж яна адна з найчысьцейшых славянскіх мовау.

*Мы горды са свае песьні!* Беларусы маюць вельмі многа песянь. Нота нашых песянь вельмі багата і адбівае у сабе душу нашаго народу. Наша народная песьня займае адно з выдатнейшых мейсц між песьнямі усіх народау сьвету. Ею цікавяцца вучоныя людзі чужых нароцау.

*Мы горды са свайго народу!* Усякі іншы народ, жывучы у такіх цяжкіх варунках, якія вы-

палі на нашу долю, загінуу-бы, а наш народ выказау нізвычайную жыццевую сілу. Енператрывау усякія злыбяды, ліхалецце і напасьці ды перахавау у сабе сваю родную мову і любоу да свае Бацькаушчыны Беларусі. Наш народ любіць прауду і красу, — ен спакойны і разважны, а пры гэтым цьверды.

*Мы горды са свае гісторыі*! Наша гісторыя—гэта ніупынная барацьба за волю, барацьба за захаванне свае нацыянальнае душы. Пры тым, мы ніколі ні галіліся на чужое. Наша гісторыя—гэта Гольгота нашаго народу, якая чыніць яму часьць і славу.

*Мы горды за сваю родную зямлю*! Наша Бацькаушчына — пекны край. Многа у ей красы: пекная у нас весна і лето, восень і зіма. Нашы пушчы, лясы і абшары апавіты паэзіей, з якой праглядае наша мінуушына.

Адным словам, *мы горды, што мы беларусы*.

### XII. **Ніколі** (верш А. З.).

Над гонар і славу,
Над чары кахання
Народную справу
І перакананне,
Што розум дыктуе,
Зауседы, я волю,
Ні здраджу ніколі.
Хай хмара навісьне
Над соннай зямлею,
Хай горо прыцісьне
Залезнай рукою,—
Я роднае мовы
Ні кіну у нядолі,
Ні здраджу ніколі!
Бушуе хай бура,
Віхор хай злуецца,

Хай вецяр панура
Завые па рэццы.—
Я роднаго краю,
Што рвецца да волі,
Ні здраджу ніколі!
Хай гром с пярунамі
Грыміць і страляе,
Маланка агнямі
Хай бліскае, зьяе,—
Свайго я народу—
Без хлеба і волі—
Ні здраджу ніколі!
Хай срэбро, дукаты
Мне сыплюць пад ногі
І скажуць: «Багаты будзь!
Кінь род убогі!»—
Я плюну с пагардай,
Народу-ж і волі
Ні здраджу ніколі!
Да самаго скону
Усякім прымусам
І сіле прыгону
Скажу: «Беларусам
Па век астануся!»—
Свае уласнай волі
Ні здраджу ніколі!

**В. Ластоўскі.**

1Ба 614

Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

# Родная мова і яе значэнне.

Хто езьдзіў па чужых краёх, той, напэўна прыкмеціў, што там усе людзі гавораць адною моваю. Німа там розьніцы ў гаворцы. Селяне і работнікі, папы і чыноўнікі, паны і купцы у крамах—усе гавораць аднака: у Францыі—па-французску, у Англіі—па-ангельску, у Нямеччыні—панямецку, у Польшчы—па-польску. Толькі у нас, на Беларусі, гавораць ні аднака: селяне адною моваю, *беларускаю*, або, як кажуць, *простаю*, а паны і чыноўнікі—іншаю мовай,—расійскаю або польскаю, нібы-то «па-панскі».

Чаму гэта так, чаму ў іншых народаў адна мова у паноў і работнікаў, а ў нашым краю дзьве мовы: нібы-то панская і простая, селянская? Ці-ж гэта праўда, што беларуская мова *простая*? Хіба беларуская мова горшая, ці ніздатна да нічога, што паны на ёй ні гавораць, а нікаторыя селяне саромяюцца і, патураючы паном, намагаюцца гаварыць па-панску, або «па-благароднаму?

Не, ні горшая нашая мова за іншыя, а можэ яшчэ і лепшая, ці гаворыць на ёй цэлых 10

мільёнаў людзей, каторыя усе разам складаюць адзін Беларускі народ, меўшы колісь сваю слаўную і магутную дзяржаву.

А толькі паны да іншыя с простых селянскіх людзей, адтрымаўшых дурную эдукацыю у царскіх школах і зрабіўшыся праз тое нібы-то панамі, цураюцца свайго роднаго і гавораць ні нашаю *беларускаю*, моваю, а маскоўскаю ці польскаю. Гэтак сама і ніграматны хлопец з вёскі, трапіўшы на заработкі у горад ці куды небудзь на Маскоўшчыну, вярнуўшыся да дому, пачынаў ламаць сваю гаворку па-чужому і пакепліваць с свайго роднаго, беларускаго. Ні водзін народ гэтаго ні робіць.—ні француз, ні паляк, ні расіян, а толькі гэтак было у нас ды яшчэ на Украіні.

А пачалося у нас гэтае двуязычча цераз тое, што народ наш беларускі доўга быў пад чужым панаваннем: сьперша пад Польшчаю, а потым пад маскоўскаю уладаю. І толькі колісь-то Беларусь была вольнаю, ні ад кога нізалежнаю, і жыла сваім ўласным дзяржаўным жыццем. Але суджано ей было страціць сваю нізалежнасьць, папасьці пад уладу чужынцаў і пражыць горкую долю, — долю зьдзеку, паняверкі і нілюдзкога гвалту.

Мала якому народу на сьвеці даводзілося пражываць трагічнейшую, ніщчасьнейшую долю, як тая ,што зазнаў за сваё гістарычнае жыцце народ беларускі. Выступіўшы на гістарычную арэну с сьвежымі маладымі сіламі, ён вытварыў быў арыгінальны палітычны лад, выявіў пачаткі уласнае

культуры. даў зароды багатаго пісьменства. Калі-б была добрая змога выраблящь ды гадаваць усё тое, што у даўнюю даўніну народ наш меў у багатых і пекных зародах, то ціпер быў-бы ён можэ-б адным з найкультурнейшых народаў у сьвеці, дастойным таварышом у суполцы культурных нацыяў. Ось жэ ні так яно склалося. Беларускі народ, што і цяпер вызначаецца сваею, як кажуць, патэнцыяльнаю здатнасьцю да культуры, сваім розумам і далікатнасьцю,—гэты народ цяпер цёмны, заштурханы, бедны. Німа яму прастору, каб выявілася яго прыродная здатнасьць і здольнасьць: яго зямля родзіць ні яму, як ні яму служаць і здабыткі сучаснай культуры... Ен стаў і да гэтаго часу астаецца толькі гноям, каб на ём маглі вырастаць пышныя кветкі чужой культуры, выпіваючы з яго уласнаго грунту усе сокі жывучыя і за гэта амаль што нічога назад ні зьвяртаючы. *«Што-ж гэта за фатальная доля такая? Якія прычыны прывялі наш край да такога становішча?»*

Гэтак пісаў і пытаўся украінскі пісьменнік С. Ефрэмаў, маючы на увазі сваю бацькаўшчыну Украіну, а далей адказваў, што многа прычын было для такога заніпаду. І найпершая можэ прычына — географічнае становішчо нашаго краю— на том раздарожжы, дзе пастаянна адбываліся ваенныя споркі суседніх народаў. Як той гарох пры дарозі,—так і жыў беларускі народ. Уціснуты паміж іншых народаў, ні маючы ні якога ад пры-

роды затулку. ён быў сходным форпостам Эўропы, яго край — мейсцам крывавых падзеяў суседзяў. Народ наш мусіў прымаць на свае грудзі першыя і найцяжэйшыя удары ад тых народаў, што сходзіліся на нашай зямлі канчаць свае споркі агнём і залезам. Найбольш гэтыя войны на нашай зямлі і канчаліся, а народ наш, прымаючы на сябе гэтыя ваенныя удары, страціў многа, вельмі многа. Страціў ён, па самы перад, адпорную сілу і ў той самы час, калі за яго сьпінаю і моцным затулкам суседзі мелі магчымасьць складаць моцныя палітычныя арганізацыі, ён і тыя здабыткі пагубіў, што надбаў быў у папяроднія часы коштам вялізорнай напругі сваіх нацыянальных сіл. А пагубіўшы свае нацыянальныя здабыткі, ён мусіў зрабіцца абьектам палітычных экспэрымэнтаў для тых самых суседзяў, мусіў стаць гноям, на яком яны свае культурныя здабыткі гадавалі і разьвівалі.

І ось сталося тое, што сталося. Усё пагубіў беларускі народ на доўгім і цяжкім гістарычным шляху сваём да цяперашняго становішча: палітычную нізалежнасьць і эканамічныя дастаткі, сваё права і асьвету, свае законы і суд, сваю школу і інтэлігэнцыю ды навят і імя свае страціў у безупынным змаганню з нядоляй сваею, у барацьбе за сваю нацыянальную індывідуальнасьць. Ен зрабіўся нацыяй без прозьвішча, нацыяй проста «людзей», шчэ горш—нацыяй «тутэйшых дзядзькоў...» «Цудны наш народ,—дзівіцца украінскі пісьменнік В. Віннічэнко пра народ украінскі:—дужы і

сумны... Меў героеў — і ніхто іх ні знае... Усё жыцце любіў волю — і усё жыцце жыў рабом... Утварыў багацтво песьні—і сам ле ні знае...» I толькі адзін застаўся яму, гэтаму народу-пакутніку, скарб ад далёкіх прадзядаў. Гэта—родная мова, і роднае пісьменство, гэтаю моваю пісанае; абое —як выраз яго духоўнае істоты, як сімвал яго асобнасьці нацыянальнай і як пачатак самасьвядомасьці, як памятка ад прамінулаго і надзея на будучыну.

Ось так і звык народ наш жыць пад чужою уладаю,—жыў, хоць на роднай, але ні на сваёй зямлі, як выславіўся вялікі украінскі пісьменнік Тарас Шэўчэнко. Ды яшчэ на ліхо нашае доля судзіла нам быць пад уладаю ні саўсім чужых народаў, як, прымерам сказаць, баўгарам і сэрбам пад Турэччынай, а чэхам пад Нямеччынай. Над намі панавалі славяне, нібы-то браты нашыя — вялікарусы і палякі. Але гэтае «брацкае» панаванне было для нас яшчэ горшае за чужынскае, бо чужыя народы, як немцы і туркі, глядзелі на падўладныя ім славянскія народы, як на чужых: іншая мова, іншая вера, звычаі—усё іншае. А на Беларусь і Польшча і Масква глядзелі заўсюды, як на свой уласны народ і усімі сіламі намагаліся давесьці і упэўніць усіх людзей, што Беларусі німа, а ёсьць толькі Польшча і Расія. Гэтак рабіло польскае правіцяльство, як яна была пад яго рукою, і палякі казалі, што Беларусі німа, а есьць толькі пагранічныя польскія землі (крэсы),

*дзе людзі гаворацъ папсованаю маскоускім уплывам польскаю моваю.* Яны стараліся выгнаць нашую мову з ужытку у школах, судох, у грамадзянскіх інстытуцыях,—адным словам адусюль, адкуль толькі можна было. Гэтак сама рабіло і расійскае правіцяльство на працязі 120 гадоў, даводзячы, мабыць, на задор палякам, што беларускае мовы німа, *есьць толькі папсованая польскім уплывам вялікаруская гаворка.*

Ні так тыя ворагі, як добрыя людзі — кажэ прыказка. І многа ліха зазнала Беларусь ні ад чужых, а ад сваіх братоў славян. За часоў польскаго панавання, усе беларускія шляхэцкія станы перафарбаваліся на палякоў. Яны адцураліся ад Беларусі і, жывучы на беларускай зямлі, стараліся ганьбіць і бэсьціць усё беларускае, стараліся забыцца, што бацьке іх і дзядэ былі беларусы і сваю кроў пралівалі за волю і права свае бацькаўшчыны Беларусі. Гэтак само робяць ціпер нашыя паны і папы, чыноўнікі і настаўнікі, што па царскаму загаду, праз царскія школы парабіліся расійцамі. Яны ні толькі адракліся ад усяго роднаго, беларускаго, а яшчэ топчуць нагамі і плююць на тое, што іх дзяды і прадзяды, як сьвятое, шанавалі. Патомкі тых слаўных беларусаў, каторыя некалі мелі сваё магутнае гасударство, чыя мова горда і сьмела зычэла па усім сьвеці і карысталася вялікаю павагаю і пашанаю,—ціпер кажуць, што народ наш ні хочэ сваіх школаў, што народ беларускі ні разумее тае мовы, на като-

рай гаворыць, што бытцам-бы ахвотней чытае і лепш разумее па-расійску, або, лепяй сказаць, павялікаруску.

Народ... Што значыць народ? Народ цёмны, нікультурны, яго трэба навучыць. Як ён можэ захацець свае беларускае школы, калі ён яе ніколі у вочы ні бачыў? Як ён можэ захацець вучыцца на сваей мові, калі за яе яго лаялі, бэсьцілі, крыўдзілі і за людзей ні лічылі? Калі ён пастаянна бачыў, што калі хто гаворыць па-беларуску, той бедны, цёмны, галодны, а хто гаворыць іначай, той багаты, асьвечны і сыты. Народ трэба навучыць, яму трэба паказаць, што, покі ні запануе у краю яго наша родная беларуская мова, да таго часу ён будзе бедны, цёмны і галодны. Толькі дэмагог і палітычны шарлатан можэ пасылацца на народную цемнату і карыстаць з яе дзеля сваіх пагляцаў, або інтарэсаў. Дзіўная гэта прывычка у іншых людзей пасылацца на народ там, дзе гэта саусім ні да рэчы, Калі хто хочэ пабудаваць дом, зрабіць якую машыну, ці правесьці залезную дарогу, дык ён звычайна зьвертаецца да спэцыялістаго, да тых, хто знаецца на гэтых справах; толькі ў палітыцы ды ў культурнай працы чамусь звыклі радзіцца с такім знаўцам, як цёмны, ніасьвечны народ...

Кепска рабілі нашыя паны--патомкі шляхецкіх станоў, —але яшчэ горш робяць тыя, хто вышаў з народу, —з вёскі ці мястэчка, —ды зрабіўся падпанкам. Мабыць ні дарма кажуць, «ні дай Бог

сьвінні рог, а мужыку панства». Парабіўшыся расійцамі, яны усіх сіл дакладаюць для таго, каб пашкодзіць Беларусі. Яны сваею ахвотаю шыліся у шпігі, у даносчыкі,—падглядалі, падслухвалі, а чаго ні дачувалі ці ні дабачалі, тое падбрэхвалі і тым падслужваліся сваім паном. Яны брахалі на шчырых, сьвятлейшых сыноў Беларусі, каторыя стараліся вывясьці народ свой с цемры і нісьвядомасьці на шырокі шлях уселюдзкаго знання, волі і сьвету. Брэшучы на беларусаў, гэтыя здраднікі і перакінчыкі палохалі нісьвядомы народ тым, што беларусы-адраджэнцы намагаюцца прылучыць нашую старонку да Польшчы.

Такую ўжо удачу маюць усе здраднікі і перакінчыкі. Яны нінавідзяць тое, ад чаго адракліся і вымагаюць гэтаго ад другіх. Ім хочацца, каб усе сьмеяліся і зьдзекаваліся с таго, ад чаго яны адцураліся, мабыць дзеля таго, каб супакоіць сваё юдзівае сумленне. Вось гэтак рабікі турэцкія янычары, што набіраліся с хрысьціянскіх дзяцей і каторых гадавалі у дусі магамэтанскае веры. Яны нінавідзелі усё славянскае і былі самымі лютымі катамі для сваіх колішніх братоў. Гэтак сама і жыд-выхрыст ужо нінавідзіць усё жыдоўскае. Былі ад веку у нас гэтыя каты-янычары. Яны звалі сябе беларусамі і душылі усё беларускае. Яны намагаліся з навукі давесьці, што беларусаў німа, ні было і быць ні можэ; што іх мова ні мова, а мяшаніна слоў польскіх і вялікарускіх. А другія заходзілі з іншаго боку і ні казалі, што беларускаэ

мовы німа, а казалі, што трэба кінуць сваё і пераймаць расійскую культуру. Гэтых янычараў памятае уся Беларусь: гэта Саланевічы, Кавалюкі, Окаловічы і многа іншых.

Што-б вы сказалі на тых дзяцей, каторыя пакінулі-б у бядзе і няволі сваю матку, што выгадавала, выняньчыла і выпясьціла іх? Што-б вы сказалі на іх, каб яны абакралі яе ды сталі-б яшчэ зьдзекавацца ды выносіць імя яе на глум і пасьмешышчо; закідалі-б яе гразёю, тыкалі-б пальцамі і насьміхаліся-б перад людзьмі і перад усім сьветам? Ці ні адвярнуліся-б вы з агідаю ад такіх вырадкаў?

А гэтак робяць усе перакінчыкі і рэнегаты беларусы. Ні шкода нам іх, ды й нівялікая карысьць з іх будзэ і таму народу, да якога яны прылучыліся. Ні патрэбны яны нам, як ніпатрэбян той брудны шум, што накіпае ў гаршку на страві. Але вялікі жаль бярэ за тых, што паслухалі іх і кінулі свой родны народ; шкода нам тых лепшых людзей, разумных і вучоных, што пераліцаваліся на палякоў і расійцаў і панесьлі сваю працу, навуку і здольнасьць ў чужую хату, на чужую ніву, занідбаўшы сваю родную.

Колісь, за часоў ніэалежнасьці Беларусі, народ беларускі быў далёка асьвечнейшы за маскоўскі. У той час, як на Маскоўшчыні стаяла страшэнная цемра, у нас панавалі навука, асьвета, шырока квітнело грамадзянскае жыцце і у дзяржаві Беларускай іствавў вольны канстытуцыённы

парадак. Цёмныя людзі маскоўскаго царства грамілі друкарні, гасілі прасьвету, баяліся кнігі, ні раўнуючы, як чумы ці халеры, тагды як нашае грамадзянство, ні здавальняючыся уласным выхаваннем у сябе дома, пасылало дзяцей сваіх да вышэйшых навук, заграніцу, дзеля большае адукацыі, дзеля лепшаго выхавання. І лепшыя, асьвечнейшыя людзі Масковіі, як Курбскі, напрыклад, або Мсьціславец ці Тодар Друкар, хаваючыся ад разьюшанаго натоўпу, шукалі ратунку у нашай бацькаўшчыне, уцякалі на т. з. Літву і знаходзілі тут братэрскі прывет і пашану. Відаць, што Беларусь на той час была для Маскоўшчыны, як Швайцарыя ці Францція нашаго часу, куды уцякалі ад царскаго гневу лепшыя людзі дарэвалюцыйнай Расіі.

Беларускія пісьменнікі таго часу мелі вялікі уплыў на пісьменство маскоўскае і спрычыняліся нават да выраблення самай літэратурнай мовы на Маскоўшчыні (М. Сматрыцкі, С. Полацкі, Е. Славініцкі і многа іншых вучоных). Праз гэта у расійскай літэратурнай мові пазаставалося і да гэтаго часу шмат беларускіх слоў, як *націск*, *патрэбнасьць*, *абарона*, *разрушэнне*, ні глядзючы на тое, што расійцы, пачынаючы з Ломаносава, старанна выкідвалі іх з ужытку у літэратуры, як словы «польскія». Ортодоксальныя вялікарусы скоса паглядалі на беларускую літэратуру за яе сьвецкі і заходня-эўропэйскі дух і, як агню, баяліся ерэтыцкіх, «латынскіх» думак з «Лі-

тоўскае зямлі». Той страх перад беларускім пісьменствам выяўляўся у тых рэпрэсіўных заходах, якіх дакладалі маскоўцы, каб ні пусьціць на Маскоўшчыну беларускіх кніг. Першы указ проці беларускага пісьменства выдаў яшчэ патрыарх Філарэт году 1627-го, прыказваючы, «чтобы впредь никто никакихъ книгь литовскія печати не покупали». У той жа год у Маскве спалілі вучыцельнае эвангэліе Транквіліона Стаўровецкага і іншыя творы гэтага аўтора, а «Катехизисъ» Лаўрэнція Зізанія Тустаноўскага надрукавалі толькі посьля цікаваго дыспута з маскоўскімі «спраўшчыкамі» і у пераробцы. Году 1672-го быў выдан новы указ: «во всѣхъ мѣстахъ всякихъ чиновъ людямъ учинить законъ крѣпкой съ большимъ подкрѣпленіемъ, чтобъ тѣ люди польскія *] и латинскія печати книгъ никто у себя въ домахъ въ тай и явно не держали, а прыносили-бы и отдавалибы воеводѣ».

Наогул, нацыянальная культура на Беларусі стаяла тагды досыць віcока, істнавала рэлігійная вольнасьць і ні было нацыянальнага уціску, так што жыды, напрыклад, мелі роўныя правэ з усімі грамадзянамі і ні было жадных нацыяцальных сутычак з літоўцамі. У 1517 годзі Ф. Скарына узяў на сябе справу вялікае вагі, — пераклаў і выдаў Біблію на беларускай мові, «ку лепшаму»,—як ён пісаў, «выразумленню люду паспалітаго». Праўда, ні натта ужо проста і зразумела яна перакла-

*) Разумеецца, беларускія.

дзена,—шмат мае ц.-славянскіх зваротаў, але гэта была эпоха у культурным жыцці беларусаў, асабліва. калі узяць на увагу шырокую публістычную літэратуру таго часу на роднай беларускай мові. Петра Вялікі, маскоўскі цар, калі захадзіўся вучыць свой маскоўскі народ, дык ён набіраў сабе вучоных з Беларусі, с Полацку, і нашыя вучоныя таго часу далі яму азбуку, т. з. гражданку, на каторай і ціпер друкуюцца расійскія кніжкі. Па беларускай граматыцы М. Сматрыцкаго расійцы доўга вучыліся грамаце, перакруціўшы, разумеецца, на свой лад, і Ламаносаў, напрыклад, напісаў па ёй першую вялікарускую граматыку.

А калі адабралі у нас нашую волю і зьнішчылі нашыя даўнейшыя правэ, то народ наш стаў цямнейшы за другіх, бо ні стало свае уласнае асьветы, свае школы, сваіх вучоных людзей і пісьменнікаў. Іншыя народы ішлі уперад, разьвівалі і мову сваю, і навуку і асьвету, а у нас, беларусаў, нічога гэтаго ні было, бо у нас адабралі нашую мову, у народу нашаго вырвалі яго язык... І народ беларускі астаўся адзін, без свае навукі, асьветы і пісьменства, без свае, як гэта кажуць, *інтэлігэнцыі.*

І гэтак вялося ні год і ні два, а цэлыя соткі гадоў. Праз гэта сталося тое, што на Беларусі усё роднае, сваё, беларускае, лічыцца *простым*, а чужое, нироднае, расійскае, ці польскае— «панскім». Яно й дапраўды—панскае, бо расійцы у палітыцы, а палякі «тутэйшаго родзаю» у

грамадзкіх установах панавалі над намі. А за імі, за гэтымі панамі, і сам народ наш перастаў шанаваць свае роднае і нават саромяецца яго. Француз горда скажэ, што ён француз: немяц ніколі ні зрачэцца свае мовы, гэтак сама ні зробіць гэтаго і паляк, ці чэх, або баўгарын, а нашыя селяне нават і ні знаюць добра, хто яны, — чыіх бацькоў, якога краю. Бывала спытаеш у селяніна —хто ён?— дык ён кажэ:«рускі», калі праваслаўны, або «паляк», калі каталік. Бывала чорная сотня заклічэ яго запісацца у «союзъ русскаго народу», набрахаўшы, што за гэта дадуць яму зямлі, дык ён і туды запішацца. Патураючы панам-перакінчыкам, і нікаторыя з нашых селян пнуцца быць «рускімі», або «палякамі», пагарджаюць усім сваім родным, вераць, што гэта усё *простае, мужыцкае* і пачынаюць перакручываць сваю мову то на расійскі, то на польскі лад, — «цо‘каюць», «как‘аюць» ды так калечаць сваю і чужую мову, што аж брыдка слухаць. І усё дзеля таго, каб падрабіцца пад паноў. Асабліва стараюцца тыя, што вучыліся у царскіх школах, або паслужылі дзе небудзь у канцэлярыі у пісцох, а ужо пра тых, што выбіліся «у паны», дык гаварыць німа чаго. Яны з родным бацькам гаварыць пры людзях саромяюцца, а нікаторыя нават чэснае бацькаўскае прозьвішчо перарабляюць на чужынскае: так, Каваль—Кавалёвым робіцца, Карась—Карасёвым, Дуброўскі—Дэмброўскім і т. д..

Гэтак было колісь с чэхамі у Аўстрыі. Нем-

цы былі саўсім анямечылі чэхаў; там гэтак сама гарадзкія людзі сталі гаварыць па-нямецку, а свае чэшскае мовы саромяліся. І толькі як настала там воля і селяне крошку прасьвятлелі, то завялі, заміж нямецкіх школ,—свае, чэскія. Ціпер там усе, і гарадзкія і вясковыя людзі, гаворачь адною чэшскаю моваю. Гэтак было у Нарвэгіі, у Фінляндзіі і ў украінцаў. Так сама пачынаецца і у нас на Беларусі.

Нідаўна яшчэ пачалося беларускае адраджэнне, пачатак яму палажылі нашы пісьменнікі і паэты і многа іншых верных і шчырых сыноў свайго краю. Яны самі скрозь гаворачь па-беларуску, пішуць кніжкі, выдаюць газэты, стараюцца увясьці сваю мову у школах і ў ваўсіх інстытуцыях нашаго краю. І ўсім нам трэба вучыцца гаварыць па-беларуску, бо хто скажэ, што ён беларус, а мовы беларускае ні прызнае, той кепскі беларус. Ні прынясе ён карысьці і роднаму краю. Міцкевіч і Сыракомля былі беларусы і ведалі,што яны беларусы, але калі яны гаварылі і пісалі папольску, то уся праца іх пашла на багацце і пыху польскаго народу. «Хто любіць Айца Нябеснаго, а бліжняго свайго нінавідзіць»,—сказаў Хрыстос: «той кажэ ніпраўду». Хто любіць свой край, а культуры яго ні прымае, той лжэц,—скажэм мы ад сібе.

Трэба нам самым шанаваць сваю мову і гаварыць скрозь па-беларуску, як гэта робяць расійцы ці палякі, тагды і чужыя людзі станудь ша-

наваць яе. А то як-жа яны стануць паважаць яе калі мы самі ні шануем?!

Дзеля гэтаго нам трэба здабыць сабе навуку і асьвету у свайй мові, каб дагнаць іншыя народы, бо мы далёка адсталі ад культурных людзей, дзякуючы таму, што ні мелі сваіх школаў. Асьвета наша павінна быць беларуская, бо толькі у свайй хаці свая воля і праўда.

Вялікі украінскі паэт Т. Шэўчэнко сказаў:

Вучыцеся, браты мае,
Думайце, чытайце.
І чужому навучайцеся,
Але й свайго ні цурайцеся,
Ні цурайцесь таго слова,
Што маці сьпевала,
Як маленькіх калыхала,
Малых спавівала.

Трэба вучыцца роднай мовы. У нас чамусь думаюць, што калі кніжка ці газэта напісана пабеларуску, то яе павінен разумець кожын, нават безграматны. Каб мова заводзілася толькі дзеля таго, каб лягчэй разумець, то можна было-б і ні турбавацца: народ беларускі здолен навучыцца усялякай мові. Але родная мова мае сваю уласную цану і значэнне. Перш-на-перш, разумеецца, яна дапаможэ нам лягчэй і хутчэй пераняць навуку і асьвету. Але сэнс у тым, што родная мова—гэта душа народа, яго скарб,—багацце і аздоба. Толькі праз асьвету у роднай мові мы дойдзем да лепшай долі, толькі яна вывядзе нас із цемры на шлях волі, братэрства і сьветлаго разумнаго жыцця. Быў час, калі у Заходняй Эўропі у школах і навуцы панавала латынь. Тагды навука, пераняная ад грэкаў і рымлян, спынілася. Людзі тапталіся на мейсцы, ламалі голаў над кабалістыкай і

алхіміей, шукаючы некаго «жизненнаго эликсиру». І толькі тагды, як трокнуліся яны, што гэтаго «жизненнаго эликсиру» і шукаць ні трэба, бо яны яго маюць і што гэты эліксір — ёсьць іх родная мова,—толькі тагды пачалася эпоха адраджэння, і людзі шпарка сталі пасувацца на дарозі да навукі, асьветы і людзкога добрабыту.

Цікава, што і народ у істоці сваей разумее гэта і выказаў гэта у сваіх песьнях і казках. Мы ведаем, што народ беларускі, змагаючыся з гістарычнымі злыднямі сваімі, страціў апошнія сілы ды мэрам заснуў летаргічным сном. І, мабыць, у гэты страшны час цішы і напыянальнаго уціску, стварылася казка пра забітаго брата. Апаведаецца яна ні ўлетку, як сьвет Божы грае і красуе, і ні ўзімку, калі мароз і завіруха, а ў час вялікаго посту, на прадвесьні, на пярэдадні новаго жыцця.

Ні грай, дудачка, ні грай!
Майго сэрца ні уражай.
Мяне брацяйкі забілі,
Нож мне у сэрцайко усадзілі.
Чарапком вочы накрылі.

Брацяйкі—гэта Польшча і Масква, пад панаваннем каторых жыла Беларусь... І апаведаецца у казцы гэтай, дзе дастаць тых лекаў, дзе можна разстарацца тае вады жывучае і гаючае, каб адратаваць забітаго брата.

Для нас, сучасных дзяцей Беларусі, тымі лекамі, тою вадою жывучаю і гаючаю ёсьць нашая беларуская мова, пісьменство і асьвета на грунці роднай культуры.

Толькі мова і асталася у народу нашаго ва усе яго злыдні, толькі яна, моў тая дудачка у казцы, грала і прамоўляла усяму сьвету, што *жыву яшчэ наш народ і жыць ен хочэ, і жыць ен можэ, і жыць ен будзе*. Адна яна, нашая родная мова, асталася памяткаю даўнейшай славы Беларусі і служыць нам ніуміручай надзеяй на будучы росквіт, а ціпер нясе народу сьвет сьвядомасьці нацыянальнай, палітычнай і грамадзянскай.

**Я. Лёсік.**

# Што было і што павінно быць.

I.

Вялізны край — губэрні: Гродзенская, вялікшая часьць Віленскай. Менская, Магілёўская, без мала уся Вітэбская, заходняя палавіна Смаленскай і паўночная часьць Чарнігаўскай ды адзін-два паветы іншых губэрняў (Цьверскай, Сувальскай і іншых) з няпомных часоў заняў беларускі народ. Перад беларусамі ў гэтым краю ніякаго народу ні было; беларусы першыя занялі яго і жывуць у ім дагэтуль.

У VIII, IX сталецці і раней, значыцца.больш тысячы год таму назад, беларусы мелі сваё асобнае князьство с сталіцай у Полацку.

Былі тады беларусы ўжо хрысьціянамі і мелі манастыры. З манастыроў найбольш вядомы у Тураве і Полацку. Мелі шмат кніг духоўных і сьвецкіх.

Усе гэныя кнігі пісаны былі па-беларуску, так сама, як і умовы, каторыя рабілі беларускія князі з другімі народамі.

Па беларуску гаварылі і пісалі князі, епіскопы і ўсе духавенство.

Беларусы ў той час былі народам дужым і ні толькі ні баяліся сваіх суседзяў: палякоў, расійцаў і іншых, але, наадварот, шчасьліва з імі вялі войны, ды ні толькі з народамі, што гранічылі з Беларусьсю, але і з далёкімі.

Увесь край наш тады быў багатым. У нас ужо тады былі вялікія месты [гарады] Горадня [Гродня], Менск, Вітэбск, Полацк і Смаленск. Месты гэтыя былі багатыя і харошыя; беларусы праз іх вялі вялікі гандаль з заходня-эўропэйскімі народамі.

Посьля беларусы злучыліся з літвінамі. Сталося адно Літоўска-Беларускае князьство. У ім, як раней у адным беларускім князьстві, усё было па-беларуску. Па-беларуску гаварылі князі, па-беларуску пісаліся законы, судзілі і маліліся па-беларуску.

Гэта Літоўска-Беларускае князьство такое было вялікае, пекнае і багатае, што аб ім ведаў увесь сьвет. Суседзі лічылі вялікім гонарам зрабіць саюз з гэтым гасударствам. Беларусы і літвіны ні нападалі без дай—прычыны на суседнія народы, ні крыўдзілі іх, але і ні давалі сябе ў крыўду.

Суседзі нашы, палякі, баяліся сілы і значэньня нашага князьства і рознымі спосабамі стараліся пашкодзіць нам. І вось, каб ні баяцца беларусаў і каб мець помач проціў другіх сваіх су-

седзяў, ім, рознымі хітрыкамі, наканец, удалося зрабіць саюз між Беларуска-Літоўскім князьствам і Польшчай, пасватаўшы сваю каралеву Ядвігу за вялікаго князя літоўска-беларускаго Ягайлу [або Ягеллу]. Ажаніўшыся с польскай каралевай Ядвігай, Ягайло стаўся разам с тым і каралём польскім.

Гэтае злучэнне Беларусі і Літвы с Польшчай было у 1386 г.

Посьля злучэння с Польшчай беларусам прыходзілося выступаць процiў палякоў, бараніцца ад іх, але нашы продкі ўмелі ўваходзіць за сваё і ні папусьцілі, каб палякі крыўдзілі наш народ. Усё па даўнаму было па-беларуску; беларусы развіваліся болей і болей.

Наш народ тады быў натта разьвіты і вучоны ці, як кажуць, культурны. Тыя рэчы, якія тады выраблялі на Беларусі, дорага прадавалі заграніцу. І цяпер яшчэ ёсьць трохі астачы даўнейшаго нашаго гэнаго хараства і багацця.

Гэная астача, як найдаражэйшы намятнік ёсьць у вялікіх музэях Нямеччыны, Англіі і Франціі. Часамі з гэных рэчаў і ў нас цяпер можна убачыць нікаторыя, як, напрыклад, шырокія ў поў аршына, тканыя з золата або срэбра, слуцкія паясы, або арнаты і рызы, а так сама розныя другія ўборы у цэрквах і касьцёлах.

Есьць кніга—біблія або пісьмо сьвятое. Гэта кніга натта вялізная. У ёй апісана жыццё выбранаго Богам народу і жыццё і навучанне І. Хрыста і Яго апосталаў. Гэтакую вялізарную кнігу

выдаць і цяпер яшчэ рэдка хто можэ, бо на гэта патрэбпа і вялікай навукі, і працы, і вялікаго кошту. А ў той час, калі мала было машын, гэта справа была вельмі цяжкая. Але беларусы тады з біблией лёгка справіліся. Пераклаў біблію на беларускую мову беларускі вучоны доктар Скарына с Полацку, а выдало ў 1517 г. таварыство беларускіх папоў у Вільні і Віленскае мешчанство з бургомістрам Бабічам. Летась, у 1917 г.,быў юбілей выдання біблії, і беларускія таварыствы сьвяткавалі гэты вялікі дзень.

Беларуская біблія была надрукавана ні толькі раней за расійскую і польскую, але і раней за нямецкую і французскую.

Посьля гэтаго яшчэ доўга, каля 200 г., беларусы ні паддаваліся палякам. Палякі заўсёды стараліся шкодзіць баларусам. У умове пры злучэнні Беларусі і Літвы с Польшчай было пастаноўлено, што, як пачнецца вайна у Беларусі або Літвы з якім нібудзь гасударствам, дык палякі павінны памагаць беларусам, а калі пачне ваеваць с кім нібудзь Польшча, тады беларусы і літвіны—палякам. Палякі гэтай умовы ні спаўнялі. Наадварот, як толькі беларусы ваевалі з маскоўцамі [расійцамі], то палякі у той час стараліся што-небудзь для сябе вытаргаваць ад беларусаў.

Як у Вялікім Князьстве Літоўска-Беларускім мелася быць вялікая вайна з Маскоўшчынай (Расией), а с поўдня напалі татары, то палякі загра-

зіўшы ад сябе вайной, прымусілі беларусаў і літвіноў згодзіцца у 1569 годзі у Любліне на шкоднае для Беларусі і Літвы цясьнейшае злучэнне с Польшчай.

У 17 сталецці палякі і польскія каралі памалу пачынаюць перацягіваць беларускіх паноў на свой бок, даючы ім прывілеі і аддаючы ім селян (мужыкоў) у паншчыну. Паном падабалася дармавая праца селян і яны памалу перайшлі да палякоў. Шляхта-ж, меншчане і селяне асталіся пры сваім, беларускім, і пачалі ходанне [барацьбу] с панамі і палякамі. Вялікшая часьць шляхты, будучы залежнай ад паноў, так сказаць, жывучы с панскай ласкі, посьля так сама за прывілеі здрадзіла свой народ, Асталіся мешчане і селяне. каторым прышлося бараніцца і ад паноў і ад палякоў. Ведама, сілы ужо цяпер былі ні роўныя. Палякі узялі верх і ў 1697 г. было выдано права, што законы павінны пісацца па-польску, бо беларускі язык «niedostępny genjuszowi polskiemu» [гэтак было напісано у гэным праве]. Гэта значыло, што палякі ніяк ні могуць навучыцца па-беларуску.

Посьля гэтаго беларуская мова асталася тольк і у цэркві і касьцелі.

Беларусы ужо ні маглі так бараніцца ад палякоў, бо селяне былі аддадзены паном у паншчыну і там гаротнічалі, мучыліся зя сваю мову, за свой народ і край.

Паны наўмысьля ні вучылі селян граматы,

каб тыя, навучыўшыся, ні пачалі дабівацца сваіх правоў, уваходзіць за усё сваё, беларускае. Але калі якому селяніну пашчасьціло вырвацца с паншчыны і ён навучываўся пісаць, то зараз-жэ клікаў селян, каб яны дабіваліся свайго роднаго, свае мовы і, хоць у кайданах, ні паддаваліся паляком.

Часам селяне паўставалі проці палякоў і паноў і, хоць на кароткі час, заводзілі на Беларусі даўнейшае жыцце, вольнае, беларускае. Асабліва вялікае паўстанне было у 1649 г., калі уся Беларусь паўстала. Усе селяне сталі вольнымі, войскі паўстанцаў мелі шмат гармат і добрае аружжо. Але посьля палякі здужалі беларусаў ды ізноў вярнулі паншчыну; паўстанцы былі пакараны, асабліва іх кіраўнікі. Гэтак палкоўн. Небаба засуджаны быў у цёмную турму. Ен да сьмерці ні бачыў ні сонца, ні людзей і есьці падавалі праз ваконце, каторае было гэтак зроблено у сьцяне, што праз яго сьвету ні было відаць.

Тыя с селян, каторы вырываліся с паншчыны і хоць трохі вучыліся, заўсёды казалі, каб наш народ ні забываўся свае мовы, бо палякі хацелі, каб нашы людзі, забыўшыся свае мовы, забыліся і ні маглі прыпомніць, што яны беларусы і ні дабіваліся сваіх правоў і свае волі.

Але як паншчына цягнулася доўга і мужыком трэ‘ было глядзець, каб хоць выжыць да лепшых часоў, то яны, стараючыся і думаючы аб адным, каб прынамсі ні згінуць, забыліся, што яны

мучаюцца за беларускае, і калі хто с селян станавіўся вольным, то толькі тады браўся за сваё і клікаў братоў сваіх бараніць беларушчыну, калі прайшоў вялікія навукі і с кніжак старых даведаўся, што мы беларусы, што мы мелі калісь сваё права і волю, былі дужымі і слаўнымі.

Як Беларусь посьля раздзелу Польшчы падпала пад Расію, то расійцы захацелі скарыстаць с таго, што беларусы ужо забыліся, хто яны, і перавярнуць іх у расійцаў. Паншчына была зроблена яшчэ стражэйшай. У 1839 г. цар Мікалай I забараніў у цэрквах і касьцелах мець набажэнство і гаварыць казанні па-беларуску.

У 1861 г. расійскі цар быў змушаны адпусьціць селян на волю. Хоць, адпушчаючы селян на волю, іх усё-ж ткі пакрыўдзілі, даючы горшай зямлі і накладаючы на яе вялізазную плату і г. п., але усё-ж такі беларускія селяне, звольненыя ад паншчыны, пачалі вучыцца ў школах, хоць і мала ў якія школы тады пушчалі селян, даведывацца хто яны, пісаць і клікаць сваіх братоў беларусаў, дабівацца сабе правоў і іншае.

Расійскае правіцельство спалохалося гэтаго і ў 1865 г. забараніло па-беларуску друкаваць кнігі. Тыя вучоныя беларусы, што хацелі выдаваць беларускія кніжкі, мусілі уцякаць заграніцу і там пісаць і друкаваць, але кніг гэных расійскае правіцельство у Расію і на Беларусь ні пушчало. Гэтакіх людзей, што браліся пісаць па-беларуску, тады лавілі, садзілі у турмы і ссылалі у Сыбір.

Але. ні гледзючы на усё гэта, посьля 1861 г. знайшлося ужо шмат беларусаў, што пісалі па-свойму.

Яшчэ і таму было забаронено друкаваць беларускія кнігі, каб простыя людзі, ні бачучы кніжкі ў сваей мове і ні ведаючы, што гэтыя кніжкі друкаваць забаронено, думалі, што іх мова запраўды ужо такая брыдкая, што ў ёй і кніжак німа—і назвалі гэту мову «простай».

У 1905 г., як была рэвалюція у Расіі, беларусы дабіліся, што ім было пазволено друкаваць кніжкі і газэты па свойму. З гэтаго часу пайшлі у нас шырока газэты і кнігі, але беларускіх школ яшчэ ні можна было мець. У школах і далей вучылі па-расійску, калечучы нашых дзяцей, кажучы ім, што мова, каторай гавораць іх бацькі брыдкая, а тая мова, каторай гаворыць расійскі бурлак—вельмі добрая. Усіх тых вучыцялёў-беларусаў, што заклалі беларускі вучыцельскі саюз і пачалі вучыць па-беларуску, пасадзілі у турмы або саслалі у Сыбір. І толькі як расійцы уцяклі з гэтай часьці Беларусі, тут можна стало закладаць беларускія школы.

Яшчэ да сёлетняго году было многа людзей, што працавалі дзеля адраджэння беларусаў. Сёлета-ж, посьля рэвалюцыі ў Расіі, у Беларусі усе селяне, мешчане і папы узяліся за сваё, беларускае, нават нікаторыя с папоў вярнуліся да свайго роднаго. Ужо цяпер ні рэдка чуваць, як у месьці людзі вучоныя гаворуць па-беларуску і шчыра працуюць у беларускім руху. Але гэтаго мала,

трэба яшчэ болей працаваць, трэба, каб ні было ніводнаго чалавека, што чураецца свайго роднаго.

Цяпер настаў час, калі нам ужо ніхто забараніць ні можэ вярнуць свае даўнейшае права і волю, зрабіць у сябе усё і усюды па-беларуску, зрабіць тое, за што нашы прадзеды мучыліся цэлыя соткі год.

II.

Але часта людзі бываюць натта дзіўныя. Як у 1861 г. асвабадзілі селян с паншчыны, нікаторыя ні хацелі ісьці на волю, кажучы: «Што-ж мы зробім без паноў?» .Гэтак і цяпер, калі мы можэм вярнуць свае правы і дабіцца лепшаго жыцця, нікаторыя з нашых беларусаў с свае цемнаты, або падвучаныя і баламучаныя ніпрыяцелямі нашаго народу, панамі, што калісь прадаліся паляком і цяпер яшчэ ні вярнуліся да свайго роднаго, кажуць: «На што гэта беларусы, літвіны? На што гэтых шмат народаў?»

Наш беларускі народ ні цяпер паўстаў, але быў спрадвеку, здаўна. Калі казаць, на што беларусы, дык можна сказаць, на што палякі, расійцы, немцы, французы, англійцы, але мы бачым, што ніхто з гэных народаў гэтак ні кажэ, наадварот, усе яны дзержацца свайго роднаго. Выступаючы проціў свайго, беларускаго, нашы людзі ні ведаюць, што гэтым ні толькі робюць вялікую шкоду свайму краю, народу, сабе і сваім патомкам, але і ідуць проціў таго, што падабаецца Самому Богу. Бо Бог стварыў розныя народы, бо калі на сьве-

ці ёсьць многа народаў, то гэтакі сьвет пякнейшы. пякней выглядае, і Богу гэтакі сьвет лепш падабаецца.

У праваслаўным псалтыры па-славянску пішацца: «Хвалите Господа всѣ языцы».

Значыцца, Бог прыказывае, каб кожны народ маліўся у сваёй роднай мове.

Дый нам сьвет больш падабаецца, калі ёсьць на ім многа народаў, пякнейшы гэтакі сьвет. Бо прыраунуйце да птушак. Есьць розныя птушкі, пекныя і брыдкія. але ніхай-бы сталося так, што асталася якаясь адна парода птушак, напрыклад. салавей, што так пекна пяе, і людзі сказалі-б: «Не, ніхай лепш будуць пекныя і брыдкія, але каб былі розныя, бо з аднэй якойсь, хоць-бы найпякнейшай птушкай, натта нудна.

Гэтак Бог, стварыўшы розныя птушкі, рыбы, розныя краскі і розныя народы, — пекны сьвет стварыў. Такі пекны, што с самаго яго пачатку чалавек глядзіць на гэты Божы сьвет. любуецца ім і дагэтуль налюбавацца ні можэ. Дык ні трэба нам перарабляць гэты Божы сьвет, перакідываючыся ў палякоў, або ў расійцаў, але трэба захововаць тое найдаражэйшае. што сам Бог нам даў; значыцца, трэба любіць свой народ і працаваць для свайго народу, трэба любіць сваю беларускую мову, шанаваць яе і гаварыць заўсёды па-свойму:

Але можэ хто такі знойдзіцца, што скажэ. «Ніхай сабе там і вучоныя людзі і паны любяць гэту мову, я ні хочу быць беларусам. буду паля-

ком або расійцам». Дык што-ж вы думаеце ён ужо і стаўся паляком? Нічагусінькі! Гэта усё роўна, каб напр., конь захацеў канечна стацца бараном, дык ён мог-бы сабе думаць колькі хачэ, што ён баран, аднак бараном ні стауся-б, але астаўся-б тым самым канём. Праўда, гэтакаму каню за яго дурное жаданне ні шкодзіло-б стацца бараном, як і таму беларусу, што хацеў-бы стацца паляком, але нічога ні зробіш,—чым яны былі, тым і астануцца, бо ніхто ні зможэ зьмяніць род, да катораго належыць.

Але ні толькі, што німа як стаць паляком ці расійцам, але да гэтаго і німа патрэбы, але, наадварот, гэта вельмі шкодна для усяго нашаго народу. для ўсяго нашаго краю, для усяе Беларусі.

Калі мы будзем любіць сваю мову, свой край і народ, тады і усім нам жыць будзе лепей, бо усе будуць глядзець, каб нашаго народу ніхто ні крыўдзіў, бо кожны аддасьць сваю сілу і здатнасьць на карысьць свайго народу, а ні будзе працаваць для вашых непрыяцелёў. Дагэтуль у нас так бывало, што паны, каторыя жывуць с працы беларускаго народу, аддавалі саваё багацце ні нашаму беларускаму народу, але польскаму. Усё з Беларусі толькі бралі, а аддавалі Польшчы. Дык німа дзіва, што наш край такі бедны.

Усім ведама, як беларусы езьдзілі у Амэрыку. Беларус ехаў толькі да брата, свата, бацькі або да знаёмаго, дый яшчэ павінен быў мець, вышаўшы на бераг, ні менш 50 р.. Калі-ж хто ні

меу сваяка, або знаёмаго. або 50 р. на Амэрыканскім беразі, дык яго варочалі назад.

А ў Амэрыцэ ізноў, колькі тае бяды с шуканнем працы!

Але начэй ёсьць у людзей, каторыя пілнуюцца свайго.

Украінцы, літвіны і іншыя, выехаўшы раней у Амэрыку, ні перакінуліся там да палякоў, як беларусы, але глядзелі свайго, заклалі там свае таварыствы, канторы і цяпер, калі едзе у Амэрыку літвін, або украінец, дык яму ні трэба мець ні 50 р., ні сваяка, ні знаёмаго; трэба толькі сказаць на беразі, што ён украінец або літвін, і яго пашлюць у літоўскую або украінскую кантору. Там сапачыне, яго дагледзяць і знойдуць работу. А страціў работу — ізноў ідзе у сваю кантору.

Бачыце, якая розніца між народам, што любіць і уваходзіць за сваё, і народам, што свайго чураіцца.

Можэ хто яшчэ скажэ: «Трэба для усіх працаваць, а ні толькі для беларусаў». Перш-на-перш, што гэта скажэ вам чалавек, каторы, запраўды, ні хочэ ні для якога народу працаваць. Народ—гэта вялікая семья. Каб у сямьі сын якіх небудзь бацькоў сказаў: «трэба, каб усім людзям жылося добра, трэба мне працаваць для усіх, а ні толькі для свае сямьі» і, кінуўшы сваю сямью, пайшоў да суседа ў найміты Але сусед яго так сама мае сваіх сыноў, сваіх дачок, мае сваю сямью. Каб яго дзеці так сама сказалі, «на што працаваць толькі

для свае сямьі, трэба працаваць для усіх» і так сама пайшлі у найміты. Гэтак сталося-б у трэцяго суседа і гэтак далей. Што-ж з гэтаго усяго вышло-б?

А вышло-б тое, што, замест працаваць у сваіх бацькоў на сваей гаспадарцы, многа людзей сталі-б парабкамі у чужых і ім самым стало-б жыць горэй, і горэй было-б тым гаспадаркам, на каторых яны працавалі-б.

Дык на што-ж гэта падобна? Ніхай дзеці кожнай сямьі працуюць для свае гаспадаркі, і усе гаспадаркі будуць дастатныя; так сама ніхай сыны кожнаго народу працуюць для свайго народу, і усім народам будзе жыць добра. Дык ні йдзема у найміты да чужых, а працуйма для роднай Беларусі.

Дык ясна, што трэба любіць сваю беларускую мову, песьню, сваіх беларускіх людзей. Ясна, што трэба глядзець, каб нашаго краю ніхто ні крыўдзіў. Трэба гадаваць так сваіх дзяцей, каб яны, вырасшы, ні пайшлі у найміты да палякоў, але любілі і працавалі для свайго роднаго, а для гэтаго трэба закладаць беларускую школу. Закладайце як найболей, ніхай ні будзе ніводнаго дзіцяці у вёсцы, каторае ні хадзіло-б у беларускую школу, і ні пушчайце сваіх дзяцей да польскіх ці расійскіх школ, бо у гэных школах зробяць з вашых дзяцей парабкоў.

## III.

Кожная вайна прыносіць с сабой штось новае, робіць зьмены. Вайной важуцца лёсы наро-

даў і важуцца ні на год, ні на два, а на цэлыя сотні, а можэ і тысячы гадоў. І чым вялікшая вайна, тым вялішыя бываюць зьмены. Дзеля гэтаго посьля кожнай вякікай вайны творуцца новыя гасударствы. І этак посьля Турэцкіх войн утварыліся Баўгарыя, Грэцыя, Сэрбія, Чорнагорыя і Румынія.

Такой вялікай вайны, як гэта, дагэтуль на сьвеці ні было. Дзеля гэтаго посьля гэтай вайны утворыцца многа новых гасударстваў. Гасударствы гэтыя новыя, як заўсёды, будуць і цяпер утворэны с тых народаў, на зямлі каторых ішла або ідзе гэта сусьветная вайна.

Траха с самаго пачатку вайна была на беларускай зямлі і цяпер трэць ($^1/_3$) усходняго фронту праходзіць праз Беларусь. Беларусь цяпер разьдзелена па дзьве часьці, адна часьць пад Нямеччыннай, другая—пад Расіей. Дзеля усяго гэтаго цяпер пад-час замірэння ёсьць спрэчкі аб тым, як Беларусі жыць далей, посьля вайны. Ведама, што тое, якой Беларусь будзе посьля вайны, многа залежыць ад ваюючых гасударстваў. Але трэба ведаць, што цяпер па ўсім сьвеце ёсьць жаданне, каб кожны народ меў сабе такое жыццё, якога ён сам сабе жадае, ці, як кажуць, ёсьць жаданне права кожнаго народу на самаадзначэнне. Праўда з жаданнем на самаадзначэнне ні зусім будуць лічыцца розныя гасударствы, але усё-ж такі жаданне кожнаго народу будзе мець вялікае значэнне на перагаворах аб міру. Дзеля гэтаго і нам, бе-

ларусам, трэба даць свой голас, каб доля наша посьля вайны была такой, якой мы хочэм і якая нам патрэбна, а ні такой, якую нам захочуць даць людзі чужыя.

Дык чаго-ж нам, беларусам, хацець?

Часам хто с паноў кажэ, што трэба прылучыцца да Польшчы, часам хто,—што вярнуцца пад Расію. Іншыя ізноў кажуць, што трэба нам мець разам з літвінамі сваё асобнае гасударство, такое, як даўней было. Ведама, трэба выбраць тое, пры каторым народу—селянам будзе жыць найлепей.

Дык разгледзім, калі народу будзе лепей жыцца. Пачнём з Расіі.

Цяпер вайна, цяжка усім жывецца, а нам тут, беларусам каля фронту, яшчэ цяжэй, дык нікаторыя, успамінаючы жыццё пад Расіяй перад вайной і спачатку вайны, хацелі-б ізной вярнуцца пад Расію. Дык разгледзім добра, як нам жылося у Расіі і чаму так жылося, а ні йначэй.

Расія вялікае гасударство. У ёй жыве многа народаў, каторых расійцы праз доўгі час заваевалі. Ні усім народам у Расіі аднолькова жывецца. Расійцам жывецца лепей, усім-жэ іншым, ні расійцам, горэй. У расійскіх губэрнях ужо больш 50 г. як уведзено земство, гэта значыцца школамі, бальніцамі, аптэкамі, дарогамі і інш. сам народ загадывае, а на Каўказе і другіх мейсцох земства зусім ні было. У Беларусі у губэрнях: Вітэбскай, Магілёўскай і Мінскай было з 1912 г. так званае «куртатае» земство, дзе народ меў ма-

ла правоў, а усё залежыло ад чыноўнікаў, што нашаго краю зусім ні знаюць і парадкаваць тут ні могуць. А ў 2-х беларускіх губэрнях Гродненскай і Віленскай земства зусім ні было. Дзеля гэтаго у нас школы і бальніцы былі горшыя, як у Расіі.

Нашым эдукованым людзям у сябе дома на Беларусі занятку цяжка было дастаць, за тое было лёгка дастаць далёка ад сваіх бацькоў, ад роднаго краю, гдзесь у Маскве, або у Сібіры. За тое расійцам у нас жылося добра. Яны тут ні толькі з меншай навукай даставалі лепшыя урады (службы, занняткі), але і будучы на тым самым урадзе, даставалі вялікшыя пэнсіі. Так сама папом тутэйшым, беларускім, плацілі меншую пэнсію, як папом маскоўцам (расійцам), што прыехалі да нас з Расіі. Гэта шкодзіло ні толькі людзям эдукованым, але і простым селянам, бо і селяне вучаць сваіх дзяцей, і вучылі-б яшчэ ахватней, каб іх дзеці, навучыўшыся, мелі лепшы занятак.

Уся зямля Беларусі: селянская, казённая і панская аброблена мазалістымі рукамі нашаго селяніна, змочэна яго потам і крывёй, дык калі гэту зямлю прадаюць, то яна павінна дастацца гэтаму, а ні каму нібудзь чужому.

Тымчасам начай было. У Расіі ёсьць *«Крестьянскій банкъ»*. Банк гэны скупліваў і прадаваў зямлю. У Расіі ён прадаваў расійскім селянам, але на Беларусі ні прадаваў беларусам ні праваслаўным, ні каталіком (а калі часам і пра-

даваў, дык за натта дарагую цану), але выпісываў з Расіі стараверaў і аддаваў ім беларускую зямлю за малую плату, яшчэ разлажыўшы яе на доўгі час. Прыпомніце, колькі у вашым вавеце ёсьць старавeрскіх вёсак—гэта усе яны былі пасаджэны на тэй зямлі, што павінна да вас належыць.

Кожны гаспадар прадае тое, што у яго астаецца ад сваей патрэбы і купляе тое, чаго у яго ні хапае.

Прадаюць і купляюць нашы гаспадары на кірмашы, на таргу, або проста у сябе дома. Але тое, што нашы людзі прадаюць, вывозіцца далёка: так сама часта прывозіцца здалёку тое, што мы купляем. Калі там, у далёкіх краёх даражэй за наш тавар плацяць, дык за яго даражэй плацяць і на нашых таргох і кірмашох. Ведама, даражэй за тавар плацюць там, дзе гэтаго тавару німа, або яго мала. Нашы гаспадары прадаюць збожжо, лён і мясо, (сьвінні, авечкі, куры, гусі). Як раз гэтаго самаго тавару даволі у Расіі. Дзеля гэтаго у Расіі мы можэм прадаваць толькі па нізкай цане.

Чым болей у якім краі фабрык, там лепей, бо на фабрыках можна знайсьці заробак. Апроч таго, чым болей прадаецца вырабаў краёвых, тым болей астаецца грошай у краі, значыцца край багацее.

Але фабрыкі могуць быць толькі тады, калі ёсьць каму карысна прадаваць тавары. Каб ні йшоў наш тавар, збожжо і мясо ў Расію, каб

наш народ ні багацеў, расійцы устанавілі так плату за перавоз па жалезных дарогах, што калі вязеш з заходу на ўсход (з Беларусі ў Маскоўшчыну), то плаціш даражэй, а калі з усходу на заход (з Маскоўшчыны на Беларусь), то плаціш танен.

Можэ папытаецеся. «Чаму-ж на Беларусі ні прадавалі за граніцу?» Гэтак траха заўсёды і рабілі; прадавалі і куплялі тавар заграніцай. Але тут новая штука была: плата за перавоз праз граніцу. Трэба было плаціць вялікае мыто за перавоз праз граніцу, прадаючы і купляючы,—дык карысьць ізноў малая была.

Нікаторыя штучныя пагної (парашкі) ёсьць толькі ў Нямеччыне, але Расія налажыла на іх такое вялікае мыто, што ні было карысьці іх купляць. Усе машыны, у тэй лічбе і найбольш нам патрэбныя гаспадарскія, заграніцай найлепшыя,але мыто на іх мала меней абходзіцца, як самі машыны.

Але можэ скажэце, што гэта ўсе было у царскай Расіі, а цяпер ні будзе. Дык ведайце, што ні цару усе гэтыя уціскі былі карысны, але усім расійцам, каторыя іх і устанавілі. І цяпер, посьля рэвалюцыі, гэныя уціскі ні зьвяліся. Але ні будзем болей гаварыць аб Расіі, даволі гэтых прыкладаў, бо усіх тых крыўд, што зрабіла для нас Расія, ні пералічыш.

Цяпер паглядзем, якое жыцце беларусам магло быць пад Польшчай. Зусім пэўна, што палякі устанавілі-б тыя самыя крыўдныя правы для Беларусі, як і расійцы. На службу беларусаў мала

прымалі-б, за усякую працу людзям с Польшчы даражэй плацілі-б, як тутэйшым, і гэтым падобна. Толькі тая была-б розьніца, што, напрыклад, за перавоз была-б вялікшая плата, калі вязеш з усходу на захад, а ні з заходу на ўсход, бо Беларусь была-б на усходзе польскаго каралеўства. Але найстрашнейшае тое, што палякі хочуць прылучыць Беларусь да Польшчы, каб на беларускай зямлі садзіць калёністаў с польскаго каралеўства. Аб гэтым пішуць у-ва ўсіх польскіх газэтах. Ні дарма паны так хочуць злучыцца с Польшчай.

Ужо калісь Беларусь была злучэна с Польшчай і беларусы дазналі вялікаго зьдзеку ад палякоў. Каб была карысьць злучыцца с Польшчай, дык і літвіны гэтаго-б хацелі.

Паглядзім, ці ні будзе найлепей сваё асобнае беларускае гасударство, свая нізалежнасьць. Маючы сваё гасударство, мы устанавілі-б у ім законы, карысныя для нашаго краю. Законы выдаваў-бы увесь беларускі народ праз сваіх выбраных дэпутатаў. Дзеля таго, што ў нас найбольш селян, дык і законы былі-б выданы карысныя селянам. Земля была-б толькі для тутэйшаго народу. Усе мейсцы, урады, службы займалі-б ні чужыя, але тутэйшыя людзі.

Мы ужо бачылі, што кожны народ адны тавары прадае, а другія купляе. Прадаючы і купляючы трэба тавары перавозіць з аднаго мейсца у другое, а найтаннейшы перавоз морам. Дзеля гэтаго, моро натта патрэбно кожнаму народу, так

патрэбно, што ніводзін народ ні можэ развівацца, ні можэ стаць багатым і шчасьлівым, калі ні мае доступу да мора. Гэта ужо прызнана усім сьветам. Дзеля таго, што кожны народ мае права жыць і быць шчасьлівым, цяпер увесь сьвет прызнае, што кожны народ павінен мець доступ да мора.

Дзеля таго, што мы, беларусы, можым мець доступ да мора толькі злучыўшыся з літвінамі, дзеля таго, што літвіны і беларусы маюць адно гаспадарскае і прамысловае жыцце і спрад-веку беларусы жылі разам з літвінамі і станавілі калісь адно суцэльнае нізалежнае князьство,—канечна патрэбна, каб беларусы і літвіны і цяпер утварылі разам адну нізалежную дзяржаву.

**Пётра з Арленят.**

# Хто мы такія?

*Ліст да простых людзей.*

— Хто вы такія? Што вы за народ?

Так пытаюцца у нас, простых людзей. Але мы і самі ні ведаем.

Вакол усе кажуць: я—паляк, я—літвін, я—жыд. А мы нават імя свайго народа забыліся. Вось і адмаўляем: я—праваслаўны, я—каталік. Але-ж гэта названне нашай веры, а ні нашаго народу.

Каталікі часам прабуюць звацца палякамі, бо вера у іх тая-ж. Але варт толькі пачуць польскую гаворку, каб праканацца, што гэта ні такі народ, як мы.

Другія, а натта праваслаўныя, называюць сябе рускімі. Але калі глянуць на рускіх с-пад Масквы, або с-пад Кіява, дык шмат у чым пабачым рожніцу між намі ды імі.

Гэта таму, што рускіх народаў т р ы. Усе яны аднаго кораню, але шмат часу жылі па-асобку і так сталося з іх тры рожных рускіх народа;

у кожнаго—свае найменне, свая гаворка, свае звычаі, свае песьні, свая вопратка.

Адзін рускі народ жыве пад Масквою і далі; завецца ён вялікарускім. Другі жыве пад Кіевам і завецца украінскім.

Мы — трэці народ рускаго кораню, завёмся беларусамі і старонка наша завецца Беларусь. Есьць паміж нас праваслаўныя, ёсьць і каталікі, але народ з нас адзін, бо у ва ўсіх адна гаворка, адны звычаі, адны песьні, адна вопратка, адзін лад жыцця.

Беларусы! Мы—вялікі народ, нас дванаццаць мільёнаў, шырока раскінуліся мы і спрадвеку жывём тут. Гэта наш край, наша старонка. Калісьці было у нас свае гасударство, скрозь чутно было нашу беларускую гаворку. У ёй пісалі законы, разбіралі справы па судох, вучылі у школах, друкавалі кнігі, спраўлялі набажэнствы у цэрквах ды касьцёлах. І усе размаўлялі па нашаму: і чыноўнікі, і папы, і паны над панамі, і вялікія князі, што правілі гасударствам.

Праз соткі год жылі мы так, ні даваючыся нікому; але урэшці перэмаглі нас палякі і запанавалі у нашай беларускай старонцы. А калі зьнішчылі Польшчу, дасталіся мы Расіі.

Жывём мы паміж палякоў і вялікарусаў, народаў моцных, і маем шмат крыўды ад іх. Бо ёсьць вялікарусы, што намагаюцца, каб мы забыліся на ўсё сваё, беларускае, выракліся яго ды зьвярнуліся у вялікарусаў, гаварылі-б і жылі па-

іхняму. Есьць і палякі. каторыя так сама хочуць зьмяніць нас на свой капыл, каб і мы сталіся палякамі.

Агляніцеся: усё нашае роднае, беларускае, марнуецца, нішчыцца, зьнікае, бо яго забіваюць, яго прыглушаюць, ім пагарджаюць; а чужое пануе, пышаецца, мае сабе пашану і павагу. І—хто ведае?—быць можэ пройдзе колькі часу і ні пазнаем мы ані нашаго краю, ані нашых дзяцей. І будзе скрозь усё чужое, нізвычнае, а свайго роднаго — нічога.

Дык ніхай-жэ ні станецца так! Ні пакінем свае гаворкі, сваіх песьняў, сваіх звычаяў,—свайго кроўнаго, спрадвечнаго, беларускаго. Ні адракомся, ні забудзем. ні кінем на глум; будземо шанаваць, бараніць, дзецям сваім аб тое запаведаць.

Ні лёгка нам вытрываць. Мы людзі цёмныя, людзі бедныя. Цяжкае нашае жыцце, горкі наш хлеб, вялікую крыўду маем мы. Есьць шляхі да лепшай долі ды ні бачым мы іх праз сваю цямнату. Але ні усягды будзе так! Чытайма, браткі, кніжкі і газэты, пісаныя у нашай беларускай гаворцэ. Тады прыйдзе канец нашай цемнаце, праясьняцца нашыя вочы, і кожны крок, што мы ступім па зямлі, будзе крокам да блізкаго шчасьця, да сьветлаго жыцця.

**М. Богдановіч.**

# Хто ты гэткі?

Першай важнай справай, каторую нам трэба зрабіць, гэта даведацца, хто мы?

Калі спытаюцца нашаго брата: — «Якой ты веры?»—дык той, хто ходзіць маліцца у касьцёл, адказывае: «я — польскі», а той, хто моліцца у цэркві, кажэ: «я—рускі».

Ці-ж гэта так?

Вось і француз, і італьянец, і шмат яшчэ хто моліцца у такім-жэ самым, як і мы, касьцелі, маюць такіх-жэ самых залежных ад рымскаго папы ксяндзоў, а яны-ж ні «польскія»,ні«польскай» веры.

Яны, так сама, як і усе, што моляцца у касьцелі. *каталікі*, — яны веры *каталіцкай*, бо німа веры ні польскай, ні францускай, ні італьянскай, а ёсьць вера каталіцкая.

А тыя, што ходзяць у царкву,--яны ні «рускай» веры, а *праваслаўнай*. Бо вось так сама ходзяць у царкву і боўгары, і сэрбы, і грэкі, а усё-ж такі яны ні рускія. яны толькі праваслаўныя.

Дык памятайце: той, хто моліцца у касьцелі, —той *каталіцкай* веры, а хто моліцца у цэрк-

ві—той веры *праваслаунай.*

Гэтая абмылка, што нашы людзі кажуць аб сабе: адзін—«я польскі», іншы—«я рускі».—узялася стуль, што ксяндзы у касьцёлі гавораць папольску, а сьвяшчэнікі —па-расійску, што адным параздавалі польскія ксёнжкі да набажэнства, а іншым—расійскія.

А гэта так сама дрэнна, бо чалавек павінен маліцца Богу у такой мове, якой гаворыць у сябе у хаце, якая яму найбольш зразумелая, бо тады і пацеры і уселякая малітва будзе больш шчырая, больш ад душы, чымсі у нейкай чужой мове.

А якая-ж наша мова?

Людзі кажуць: «простая», а іншыя яе называюць «мужыцкай». Яна можэ толькі дзеля таго простая, што для нас больш за іншыя зразумелая, ба калі мы гаворым гэтай «простай» мовай, то нам німа чаго сароміцца ды баяцца, што мы нейкае слово перакруцім, скажэм ні так, як трэба, бо мы гэтай мовай гаворым змалку дзён, мы да яе прывыклі і ведаем, што і як у гэтай мові называецца.

«Мужыцкай» мусіць назвалі яе дзеля таго, што ёю гавораць мужыкі,бо паны ні так між сабой гутараць.

А папраўдзі мова гэтая называецца *беларускай,* і яна такая самая добрая і пекная, як і уселякая іншая.

Праўда, што гэтай мовай нідаўна гаварылі толькі селяне, ды вось ужо нелькі год, як і у месьці пачалі так сама гутарыць, як і на вёсцы, пачалі друкаваць кніжкі, і ні толькі да наба-

жэнства, а і рожныя іншыя, пачалі нават друкаваць газэты...

Чаму-ж гэта?

А вось чаму: бо гэтай мовай гаворащь між сабоў ні толькі у аднэй ці у дзьвёх вёсках, а ёю гавораць і у вітэбшчыне, і у магілёўшчыне, і у мінпчыне, і у гродзеншчыне, і у віленшчыне...Бо ёю гавораць больш за 10 мільёнаў людзей, бо ёю гаворыць цэлы народ, а народ гэты завецца так сама, як яго мова, *беларускім*.

Дык памятайце: хто гаворэ па-беларуску — той беларус.

Быў час, калі і паны, і князі, і біскупы нават гаварылі і пісалі па-беларуску. І цяпер яшчэ захавалося многа розных дакумэнтаў і іншых важных папераў, каторыя пісаны так, як мы цяпер гаворым,—значыць, *па-беларуску*.

Многа такіх дакумэнтаў ёсьць у старых бібліотэках. Калісь так сама, як цяпер, друкаваліся кніжкі у гэтай мове...

Як наш край злучыўся с Польшчай у адно гасударство, а посьля меў аднаго супольнаго караля,—каралі гэтыя спачатку часта жылі у Вільні, а посьля — дык усё болей у польскім месьці Кракові, а пазьней, дык ужо толькі у Варшаве. Яны гаварылі па-польску, а за імі пачалі гутарыць папольску і розныя нашыя вялікія паны, а за панамі і уся шляхта, бо ведама, што шляхта заўсёды робіць тое, што і вялікшыя паны, каб быць праз тое палабнейшай да іх...

Вось як здарылося гэта!..

І тыя самыя, што кінулі сваю родную мову, пачалі сьмеяцца с тых, каторыя яе яшчэ трымаліся, называючы гэтую мову «простай», «мужыцкай».

Ды адно сумна: што часам і нашы селяне пачыналі верыць, што гэтая мова якаясь простая— нікчэмная, што разумны чалавек павінен гаварыць так, як паны: па-польску, або па-расійску.

Людзі! ні стыдайцеся сваей беларускай мовы, бо яна—пекная мова! Прыежджаюць с чужых краёў вучоныя людзі, едуць на вёску, каб навучыцца гэтай мовы... Ды цяпер ужо ні толькі у вёсцы пачуеш беларускую мову: пачуеш яе і ў месьці, а гавораць ёю ні сермяжныя селяне-хлебаробы, а паны у чорных сурдутах і духавенство.

Беларусы! памятайце, што вы належыце да нізалежнаго калісь і сільнаго народу, і ні стыдайцеся мовы бацькоў сваіх, бо гэта сорам і грэх,— так сама, як грэх стыдацца беднай радні свае!

Мы на пачатку сказалі, што, калі хто моліцца у касьцёлі, той веры каталіцкай, а хто у цэркві, той праваслаўнай.

Цяпер, калі вас спытаюцца аб веры вашай, вы ведаеце, што трэба адказаць.

Калі-ж спытаюцца: якога вы народу, якой вы нацыянальнасьці,—вы павінны адказаць: мы—беларусы!—бо мова ваша беларуская. Кожын павінен сьмела і шчыра заўсёды прызнавацца, што ён беларус.

Калі-ж бы вам сказалі: «ты каталік, значыць

—ты паляк», дык такім людзям адкажыце:

— Хаця я веры каталіцкай, а усё-ж такі я ні паляк, а беларус, бо каталіцкую рэлігію маюць і французы, і італьянцы, і іншыя, а яны-ж ні палякі, ды па-польску нават зусім ні разумеюць.

Беларусы! Калі мы будзем ведаць, хто мы, камі мы сьмела будзем прызнавацца, што мы ніхто іншыя, як беларусы, то і для нашаго дзесяцімільённаго народу заясьнее лепшая доля, і мы будзем і патрапім жыць вольна, як і іншыя народы, ні патрабуючы, каб намі упраўлялі палякі, ці маскалі, ці іншыя чужынцы.

Вось ужо чацьвёрты год ідзе вайна. Многа, вельмі многа крыві ужо пралілося. Ці-ж кроў гэтая вылівалася дарма? Ці-ж ужо ніякаго пажытку з гэтаго ні будзе?..

Будзе! Посьля вайны шмат будзе перамен. Зьменяцца граніцы гасударстваў. Што было сільнае, станецца слабым; што было прыбітае, загуканае,— уваскросьне да жыцця.

Бог дасьць, і мы пачнем жыць іначай.

Доўга трывала наша няволя, ды канец яе ужо набліжаецца!

*Перадрук адбіткі з № 93 «Гомана».*

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

© МІЖНАРОДНАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ БЕЛАРУСІСТАЎ

© *БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА АРХІВІСТАЎ*

**БЕЛАРУСКАЕ КААПЭРАЦЫЙНА ВЫДАВЕЦКАЕ ТАВАРЫСТВА "АДРАДЖЭНЬНЕ" МЕНСК 1992 г**

заказ 16

**паўторнае перавыданьне**

19-00

# Новыя кніжкі:

1) **Літэратурны Зборнік**, сшыт. I. . 90 к.
2) **Сцэнічныя творы**, Тараса Гушчы 50 „
3) **Дзіцячая Чытанка** . . . . . . 50 „
4) **Матчын Дар**, зборн. верш. А. Гаруна . . . . . . . . . . . . . 2 рб. —
5) **Бярозка**, апаведанні Ядвігіна Ш. . 75 „
6) **Сымон Музыка**, поэма Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . 1 рб. 50 „
7) **Тарас на Парнасе** . . . . . . 30 „
8) **Зборнік сцэнічных твораў**, сшыт. I. 4 рб. —
9) **Першыя малітвы** . . . . . . . 30 „
10) **„Вольная Беларусь“**, (у аправе) за 1/2 г. 1918 г. . . . . . . . . . . 6 рб. —
11) **Што трэба ведаць кожнаму беларусу** (зборнік артыкулаў) . . . . . 1 рб.

**Менск, Беларуская Кнігарня,**
**Захараўская, 18.**

## Цана 1

B00000002 18862